І. Д. Воюш В. І. Аляшкевіч

Літаратурнае чытанне 3

Частка 2

Вучыцеся быць уважлівымі

1. Знайдзіце памылкі:



Воўк мычыць,
а карова вые?

?

Рыдлёўка пілуе,
а піла капае?

2. Якія назвы прадметаў пачынаюцца з аднолькавых літар:

..ара

..ыба



..ім

..іры

..от

..от

Змяняйце літары, складайце новыя словы. Колькі слоў атрымалася?

Здагадайцеся, хто чым займаецца

настаўнік

урач

дворнік

Вучыць дзяцей...
Лечыць людзей...
Прыбірае двор...
Будуе дом...
Гатуе ежу...
Прадае тавары...

будаўнік

кухар

прадавец

І. Д. Воюш В. І. Аляшкевіч

Літаратурнае чытанне

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 2

Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2020

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 821.161.3.09(076.2)
ББК 83.3(4Беи)я72
В79

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра беларускай і замежнай літаратуры
філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (дацэнт кафедры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Н. В. Заяц*);
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Ельская дапаможная школа-інтэрнат»
С. В. Фяськова

Умоўныя абазначэнні

— адказваем на пытанні, выконваем заданні

— вучымся чытаць правільна

— слоўнік

— гуляем разам

— разважаем, думаем самі

— робім разам з сябрамі

— робім разам з дарослымі

— жыццёвыя парады

— цікава ведаць

Воюш, І. Д.

В79 Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 3-га кл. першага аддз-ня дапам. шк. з беларус. мовай навучання : у 2 ч. Ч. 2 / І. Д. Воюш, В. І. Аляшкевіч. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2020. — 127 с. : іл.

ISBN 978-985-553-634-6.

УДК 821.161.3.09(076.2)
ББК 83.3(4Беи)я72

ISBN 978-985-553-634-6 (ч. 2)
ISBN 978-985-553-636-0

© Воюш І. Д., Аляшкевіч В. І., 2020
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2020

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

НЕ БАІМСЯ МЫ МАРОЗУ І МЯЦЕЛІЦЫ!

Зіма

!	Раз-гу-ля-ла-ся	Рас-сту-пі-лі-ся

Разгулялася зіма,
што супынку ёй няма.
Дзе быў двор голы,
намяло горы.

Хлапчукі парашылі
ўзысці на вяршыні.
Горы расступіліся —
дзеці ў снег зваліліся.

(Паводле Дануты Бічэль)

Супы́нку нямá — *тут:* доўга.

1. Пра якую пару года гаворыцца ў вершы?
2. Колькі снегу намяло на двары? Што значыць *горы*? Гэта многа ці мала?
3. Куды палезлі хлапчукі? Што з імі здарылася?
4. Якія *«горы расступіліся»*?
5. Прачытайце выразна. Вывучыце верш на памяць па жаданні.

Загадка

Шар пастаўлены на шар,
нос чырвоны на ўвесь твар,
рот і вочы — вугалькі.
Адгадайце, хто такі?

С			Г				К

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Мае канькі

Пра-зры-сты
Раз-мах-ваю
Па-бліск-ваю
Іс-крыц-ца

Адзяю хутчэй канькі
і да рэчкі — нацянькі́.
Там празрысты звонкі лёд,
там вясёлы карагод.
Я размахваю рукамі,
я паблісквaю канькамі.
Быццам вецер,
разганюся,
закручуся,
развярнуся.
Лёд іскрыцца, звоніць.
Хто мяне дагоніць?

(Паводле Дануты Бічэль)

Нацянькі́ — *тут:* кароткай дарогай.

1. Куды спяшаецца хлопчык?
2. Які ў яго настрой — сумны ці вясёлы?
3. Разгледзьце малюнак. Ці падабаецца хлопчыку катацца?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4. Як катаецца герой верша? Прачытайце.

5. Пры чытанні перадайце радасны настрой хлопчыка.

6. Пакажыце, як катаюцца на каньках.

7. Дзе бывае *«празрысты звонкі лёд»*? На катку ці на рэчцы?

Загадкі

Па сцяжыне, па дарозе
бегчы я ў іх не ў змозе,
і па снезе не ідуць,
лёд убачаць — і лятуць!

К					

Удзень шкло разбіта, а нанач устаўлена. *Ё, д, л*

Канькі вельмі вострыя. Будзьце ўважлівыя, калі абуваеце іх. Захоўвайце канькі ў чахле, каб не парэзацца.

Катайцеся толькі на катку. Катацца на рацэ ці возеры небяспечна! Лёд можа трэснуць. Вы можаце праваліцца пад лёд.

Госця

Ходзіць з хаты ў хату
госця-каляда.
Як каза, рагатая,
з лёну барада.
Мы адны вячэраць
селі ў добры час.
Ой, і ў нашы дзверы
стукае якраз.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Зябка на марозе,
адчыняць пайду —
і за стол запросім
госцю-каляду.

(Паводле Міколы Маляўкі)

Зя́бка — холадна.
Каля́ды — народнае свята ўшанавання зімы. Удзельнікі ходзяць па хатах у касцюмах Казы, Мядзведзя і іншых.

1. Хто просіцца ў хату? Разгледзьце малюнак.
2. Як выглядае госця-каляда? Раскажыце з дапамогай малюнка.
3. Калі святкуюць Каляды? Спытайцеся ў дарослых.
4. Ці бачылі вы, як святкуюць Каляды? Раскажыце. Што вам спадабалася?
5. Прачытайце верш выразна.
6. Прачытайце калядную песню. Якая жывёла жадае гаспадарам дабрабыту?

Калядная песня

Го-го-го, каза! Го-го-го, шэрая!
Расхадзіся, разбяжыся
па ўсяму двару
гаспадарскаму.
Дзе каза нагой — там жыта капой,
дзе каза рогам — там жыта стогам.

Лыжнік

Трэ-ні-рую-ся	Пры-свя-чаю
Ба-лель-шчы-каў	Пе-ра-мож-ны

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Я не падаю ў знямозе,
трэніруюся штодня, —
і спявае на марозе,
і спрыяе мне лыжня.
Я балельшчыкаў вітаю,
выціраю з твару снег,
роднай школе прысвячаю
пераможны свой забег.

(Паводле Міколы Маляўкі)

Не ў знямо́зе — *тут:* не стомлены, не змораны.
Штодня́ — кожны дзень.
Спрыя́ць — дапамагаць.
Забе́г — *тут:* спаборніцтва.

1. Прачытайце назву. Пра каго гэты верш?
2. Пра што паведамляе лыжнік?
3. Чаму ён не стамляецца? Прачытайце.
4. Які настрой у лыжніка?
5. Каму лыжнік прысвячае сваю перамогу? Ці любіць ён сваю школу?
6. Прачытайце верш. Пакажыце, як рытмічна рухаецца лыжнік.

На фотаздымку Дар'я Домрачава — славутая беларуская лыжніца. Яна перамагла сваіх саперніц амаль на ўсіх спаборніцтвах. Шмат разоў была чэмпіёнкай свету і Алімпійскіх гульняў.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Сапраўдныя сябры

	Ад-на-клас-ні-кі	Пад-ра-ман-та-ваць
	Спа-дзя-вац-ца	Удзяч-на-сцю
	Ста-рэй-шай	Ус-пых-вае

На школьным двары залілі вялікі каток. Алёнчыны аднакласнікі кожны вечар прыходзяць сюды з канькамі.

Алёнка пазірае, як спрытна яны катаюцца. «Былі б у мяне канькі, я таксама добра каталася б», — думае дзяўчынка. Але канькоў у Алёнкі няма. Ды і спадзявацца пакуль што не прыходзіцца. Трэба купіць паліто старэйшай сястры. Падрамантаваць кватэру...

— Чаму ж ты прыйшла на каток без канькоў? — цікавіцца Янка.

Дзяўчынка не адказвае. Ганя спынілася каля іх.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Хадзем, Алёнка, я дам табе свае канькі, — кажа яна.

— А я навучу цябе катацца, — дадае Янка.

Алёнка з удзячнасцю глядзіць на сяброў. І на яе твары ўспыхвае ўсмешка.

(Паводле Ядвігі Бяганскай)

1. Куды хадзілі дзеці кожны вечар?
2. Чаму Алёнка не каталася?
3. Чаму яна не прасіла бацькоў купіць ёй канькі? Прачытайце.
4. Разгледзьце малюнак. Што прапанавалі дзяўчынцы Ганя і Янка?
5. А як бы вы паступілі?
6. Падумайце, ці ёсць у Алёнкі сапраўдныя сябры.
7. Хто з вас умее катацца на каньках? Хто вас навучыў?

Прыказка

Не радуйся беручы, а радуйся даючы.

На горцы

За-лі-ва-юц-ца Раз-ля-та-ец-ца

Раз, два, тры!
Раз, два, тры!
Санкі ўніз ляцяць з гары,
а на санках — хлапчукі,
два гарэзы-сяброукі.
Смехам заліваюцца,
снег аж разлятаецца.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З жартамі-пацехамі
прама ў гурбу ўехалі,
разляцеліся снапамі
і рагочуць разам з намі.
Ну, а ты чаму прыціх?
Не баішся? —
Марш да іх!

(Паводле Міхася Пазнякова)

Гарэ́зы-сябрукі́ — *тут:* вясёлыя, непаседлівыя сябры.

Разляце́цца снапа́мі — *тут:* перакуліцца.

1. На чым каталіся хлопчыкі? Які ў іх настрой?
2. Куды ўехалі сябры? Як яны ўпалі — побач або ў розныя бакі?
3. З чым параўноўваюцца хлопчыкі? Прачытайце.
4. Як паводзілі сябе дзеці? Плакалі або смяяліся?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Снег мяккі, а лёд які? Што здарыцца, калі ўпасці на лёд?

6. Ці здаралася з вамі, што вы падалі ў снег? Як сябе паводзілі? Раскажыце.

Прыпеўка

Я на саначкі саджуся,
ліха з горачкі качуся.
Хай ад снегу белая,
затое дужа смелая!

(Паводле Алены Церашковай)

На лыжах

Толькі выпаў першы снег —
мы на лыжы сталі...
Звонкі гоман наш і смех
абуджае далі.

Мы ляцім з крутой гары,
услед шумяць бярозы.
Не пужаюць нас вятры,
халады, марозы.

(Паводле Паўлюка Пранузы)

Го́ман — *тут:* вясёлыя галасы.
Абуджа́е да́лі — *тут:* гучыць, звініць.

1. Калі дзеці сталі на лыжы? Прачытайце.

2. Як вы разумееце словы *«звонкі гоман наш і смех абуджае далі»*?

3. Як дзеці катаюцца з гары? Знайдзіце ў тэксце.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4. Чаму мароз не пужае лыжнікаў? Ці цёпла, калі рухаешся?

5. Знайдзіце словы *снег* і *смех*. Ці падобныя яны па гучанні? Знайдзіце яшчэ словы, падобныя па гучанні.

6. Вывучыце верш на памяць.

Зімовая азбука

Мыш-ка-ва-ла
Пры-жму-рыў

Пра-ска-каў
Рас-сы-па-ныя

Прыйшоў з лесу Юркаў бацька. Ён павесіў на сцяну стрэльбу і сказаў:

— На палянцы ліса мышкавала.

— А як ты дазнаўся? — спытаў Юрка.

— Азбука такая ёсць, — хітра прыжмурыў вока бацька. — Хочаш, заўтра пойдзем у лес? Я навучу цябе разумець тую азбуку.

І вось ідуць яны ўдвух: наперадзе бацька, ззаду Юрка. А ўсюды на снезе — сляды і сляды.

Сляды сарокі

Сляды мышы

Сляды зайца

Сляды лісіцы

Сляды вароны

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Гэта сарокі падбіралі насенне з дрэў. Доўгімі хвастамі за сабой па снезе чыркалі, — тлумачыць бацька. — А там вунь і лясная мыш ланцужкі слядоў пакінула.

— А гэта хто прабег? — пытае Юрка.

— Гэта заяц праскакаў. Заяц скача шырока — заднія ногі ў яго доўгія. Гэта яго сляды. Заяц спяшаўся або ўцякаў ад галоднай лісы.

— А гэта чые сляды?

— Гэта галодныя вароны таўкліся каля дарогі. Яны падбіралі рассыпаныя зярняткі аўса.

— Дык гэта азбука? — спытаў Юрка.

— Ага, вось яна — зімовая азбука, — сказаў бацька. — Вучыся чытаць яе: усе сакрэты табе лес раскрые.

(Паводле Міхася Даніленкі)

Мышкава́ць ***(пра лісу)*** — паляваць, шукаць пад снегам мышэй.

А́збука — алфавіт.

Чы́ркаць ***(хвастом)*** — пакідаць на снезе рыскі хвастом.

1. Адкуль прыйшоў Юркаў бацька?
2. Аб чым ён расказаў сыну?
3. Куды назаўтра адправіўся Юрка з бацькам?
4. Чые сляды яны ўбачылі? Якую азбуку паказаў хлопчыку бацька?
5. Разгледзьце малюнак. Д а п о ў н і ц е: *сляды сарокі, ..., ..., ..., ...* .

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

6. Прачытайце па ролях. Ці аднолькава чытаюцца пытанні і адказы?

7. Чаму вучыць гэты твор? Пра якую «мову» прыроды вы даведаліся?

8. Раскажыце сябрам, ці бачылі вы сляды на снезе. Ці здагадаліся, чые гэта сляды?

Скорагаворка

Адна сарока — адна марока,
сорак сарок — сорак марок.

Народная прымета

Сарока навіны на хвасце прыносіць.

Ветлівая сінічка

1

Па-сне-даў-шы	Пе-ра-ско-чы-лі
Кан-струк-та-ра	Пра-цінь-каў-шы
Са-праўд-ным	Чыр-ва-на-гру-ды
Зда-гад-ва-ец-ца	Па-крыў-джа-ны

Паснедаўшы, Дзяніска заўсёды сядае за стол. Ён малюе ці будуе замак з дэталей канструктара. Хлопчык любіць гуляць у сваім кутку. Тут ён адчувае сябе сапраўдным гаспадаром. Дый з акна ўсё добра відаць...

Дзяніска бачыць, што па краі балкона бадзёра скачуць два вераб'і. «Сагрэцца хочуць, — здагадваецца ён. — Спадзяюцца, што так цяплей стане. Ды дзе там!»

Хлопчык паціху вылазіць з-за стала. Ён асцярожна падыходзіць бліжэй да акна. А вераб'і тым часам пераскочылі ў скрынкі з зямлёй. Там сумна

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

тырчаць сухія бадылі раслін. Праўда, дзе-нідзе на іх яшчэ засталося насенне кветак. Чым не спажыва для галодных птушак?

Услед за вераб'ямі з'яўляюцца дзве жвавыя сінічкі. Грудкі жоўценькія, сінія з адлівам галоўкі. Белыя палоскі на крылцах. Сапраўдныя прыгажуні! Нешта працінькаўшы адна адной, сініцы паляцелі. Замест іх на балконе ўсеўся важны і пыхлівы чырванагруды снягір. Пакруціўся, убачыў, што іншыя птушкі нічога яму не пакінулі. Пакрыўджаны снягір паляцеў...

Бады́ль — сухая сцябліна.
Спажы́ва — ежа, корм.
Пыхлі́вы — горды, ганарысты.

1. Дзе любіў сядзець хлопчык?
2. За якімі птушкамі ён назіраў праз акно?
3. Што шукалі птушкі? Чаму?
4. Калі можна ўбачыць снегіра? Ад якога слова ўтворана назва *снегіры*?

2

Май-стра-ва-лі
Пры-ма-ца-ва-лі
Пад-сіл-ка-ваў-шы-ся
Па-ка-шта-ваў-шы

«Трэба хутчэй будаваць кармушку!» — падумаў хлопчык. І ў суботу з бацькам яны ўзяліся за справу. Майстравалі ўвесь дзень. Атрымалася сапраўдная хатка для птушак.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У нядзелю якраз было сонечна. Дзяніска з татам прымацавалі хатку на балконе. Вераб'ям накрышылі хлеба. Сініцам паклалі кавалачкі сала. Не паспелі зачыніць дзверы, як адзін верабей хутка знайшоў ежу. Весела чырыкнуў і паляцеў клікаць сяброў.

Што рабілася каля птушынай хаткі праз некалькі хвілін! Падсілкаваўшыся хлебам, вераб'і пакінулі сала сініцам. І весела паляцелі далей.

Сініцы аказаліся больш выхаванымі. Пакаштаваўшы смачнага сала, адна з сінічак падляцела да самай шыбы. Яна прыветна паківала з боку ў бок галоўкай. Пасля асцярожна стукнула дзюбай у шкло. Якраз там, дзе стаялі і назіралі за птушкамі тата з сынам.

— Глядзі! — узрадаваўся Дзяніска. — Сінічка нам дзякуй кажа!

(Паводле Таццяны Мушынскай)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Падсілкава́цца — перакусіць, пад'есці.

1. Што змайстравалі тата з Дзяніскам?
2. Чым яны частавалі птушак? Прачытайце.
3. Як паводзілі сябе вераб'і? А як сінічкі? Раскажыце з дапамогай малюнка.
4. Якога колеру грудка ў снегіра, сінічкі, вераб'я, сарокі?
5. Хто дзякаваў тату і Дзяніску? Як адчуваў сябе Дзяніска?
6. Ці клапоціцеся вы зімой пра птушак? Які корм нарыхтоўваеце?
7. Чаму вучыць гэты твор? Што вы з дарослымі можаце змайстраваць для птушак?

Прыказка

Птушку пазнаюць па пер'і,
а чалавека — па справах.

Нашы сябры

Пша-ніч-кі	Шча-бя-туш-кі
Вя-сен-няе	Ве-ся-луш-кі

Снегіры, сінічкі,
сыплю вам пшанічкі,
крупак, крошак хлеба,
вам жа мала трэба.
Ешце, любыя сябры,
не ляціце ў лес, бары,
а жывіце ў двары
да вясенняе пары.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вось для вас кармушкі,
птушкі-шчабятушкі,
нашы весялушкі.

(Паводле Станіслава Шушкевіча)

1. Якіх птушак кармілі дзеці? Што яны змайстравалі?
2. Якім кормам частавалі птушак? Прачытайце.
3. Куды дзеці запрашалі птушак? Як звярталіся да іх?
4. Знайдзіце ласкавыя словы. У дапамогу вам словы *пшаніца, сініца* і *шчабятаць, весяліць*.
5. З чаго можна зрабіць кармушку? Дзе яе трэба размяшчаць?
6. Прачытайце выразна. Па жаданні вывучыце верш на памяць.

Народныя прыметы

Калі вароны садзяцца на ніжнія галінкі дрэў — да ветру, а калі на верхнія — на мароз.

Калі сінічка з раніцы пішчыць — ноччу чакай марозу.

Кармушкі

Сала

Мы паставілі кармушкі.
— А што ж есці любяць птушкі?
Нам настаўніца сказала,
што сініцы любяць сала.

Арабіны

Харч найлепшы снегірыны —
арабіны,
журавіны.

Журавіны

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Проса

Вераб'і, шчыглы, аўсянкі —
ім давай свае прыманкі:
проса,
хлеб,
авёс,
каноплі...

Авёс

Хлеб

Каноплі

(Паводле Авяр'яна Дзеружынскага)

Харч — ежа, корм.
Арабі́ны — рабіна.

---

1. Чым зацікавіліся дзеці?

2. Правядзіце пальчыкам ад назваў птушак да корму, які ім падабаецца:

сініцы	*проса, хлеб, авёс, каноплі*
снегіры	
вераб'і	*арабіны, журавіны*
шчыглы	
аўсянкі	*сала*

3. Які корм вам знаёмы? Знайдзіце на малюнках. Які корм не знаёмы? Спытайцеся аб ім у дарослых.

4. Што новага вы даведаліся з верша? Чым вы цяпер будзеце карміць птушак?

Птушкі любяць сухое насенне раслін — аўса, проса, пшаніцы, грэчкі. А людзі гэта насенне ачышчаюць і вараць у вадзе. Атрымліваецца каша. З аўса гатуюць аўсяную кашу. З проса гатуюць прасяную кашу. З пшаніцы — манную. З грэчкі — грачаную.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прыказка

Пакармі птушак зімою, яны адплацяць вясною.

Зайчык

За-кру-жы-лі
За-тра-шча-лі
Даў-га-ву-хі
Ка-жу-шок

Закружылі завірухі,
затрашчалі маразы.
— Зайчык, зайчык даўгавухі,
ці не мерзнеш ты, скажы?
— Я заўсёды рупны, хуткі,
загадзя зіму сустрэў:
кажушок, як снег, бялюткі
на зімовы час надзеў.
(Паводле Міхася Пазнякова)

Ру́пны — старанны.
За́гадзя — наперад, раней.

1. Як надышла зіма?
2. Пра што запыталіся ў зайчыка? Прачытайце.
3. Што ён адказаў? Прачытайце.
4. Як ён падрыхтаваўся да зімы? Якога колеру ў яго футра?
5. Як вы разумееце выраз *«загадзя зіму сустрэў»*?
6. Прачытайце верш па ролях. Выдзяляйце голасам пытанні і адказы.

Скорагаворка

Зайчынага зайку
завуць Зазнайка.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Лічылка

Раз, два, тры, чатыры —
зайчык вушкі натапырыў.
Ідзе з лесу воўк, воўк
і зубамі шчоўк, шчоўк.
Мы схаваліся ў кусты:
зайка, я, і ты, і ты.

(Паводле Васіля Віткі)

1. Развучыце лічылку разам з сябрамі.

2. Станьце ў круг. Палічыцеся, хто першым пойдзе з класа на перапынак.

Загадка

Хтосьці скажа — баязлівы,
ну а хтосьці — палахлівы...
Але хай жа знае кожны:
проста *з..йч..к* — асцярожны!

Люты

1

Лю-та-ваць За-стра-ка-та-ла

Ідзе па зямлі Люты...

Зайшоў Люты ў лес да лясных птушак ды звяроў.

— О-го-го-го! — крычыць на ўвесь лес. — Я — лю-у-у-у-уты! Іду лютаваць! Сумёты намятаць! Дарогі засыпаць!

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— А ў мяне цёплае дупло. Я накрыюся хвастом і буду спаць. Лютуй, — адказала вавёрачка.

— А я ў бярлозе лапу смакчу, — кажа скрозь сон мядзведзь. — Лютуй сабе.

— А я ў нару схаваюся, — матнуў рудым хвастом ліс.

— А я ямачку ў снезе зраблю, — сказаў заяц. — Я цяпер беленькі. Ніхто мяне не прыкмеціць.

— А мне не страшны ні мароз, ні завея. Я ў цёплай камізэльцы, — ціўкнуў снягір.

— Я падалася да ч-ч-чалавечага жытла, — застракатала сарока.

І ўсе звяры і птушкі пахаваліся. Хто ў нару, хто ў дупло, хто пад снег.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Лютава́ць — злаваць.
Сумёты — гурбы.
Камізэ́лька — верхняе адзенне без рукавоў.
Завéя — мяцеліца.
Ці́ўкнуць — *тут:* падаць голас, піскнуць.

1. Успомніце назвы зімовых месяцаў. Хто такі Люты?
2. Каму пагражаў Люты? Што ён рабіў у лесе?
3. Як адказалі яму вавёрка, мядзведзь?
4. Што адказалі ліс, заяц? А снягір і сарока?
5. Ці спалохаў лясных жыхароў Люты? Перакажыце.

2

Ад-па-чы-ваць Тэ-ле-гра-му
Вы-гля-ну-ла Ле-дзя-шоў

Засердаваў Люты.

На рэчцы страляе лёд. А Люты лютуе. Доўга лютаваў. Нарэшце стаміўся, лёг адпачываць і заснуў. Спіць Люты і не чуе бяды.

А Сонейка выглянула з-за хмары, нагрэла на сасне снег... І пачало з ледзяшоў капаць: кап... кап...

Выглянула з дупла вавёрка і зацокала:

— Спіць Люты. Спіць, не чуе, што Вясна яму рыхтуе.

Вылецеў з дупла дзяцел і як застукае дзюбай, тэлеграму адбівае:

— Спіць Люты, спіць пад сасною... А Сакавік ужо за спінаю, а з ледзяшоў: кап... кап...

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Раптам — кап! — проста Лютаму на нос. Падхапіўся Люты.

Чуе, Сакавік ужо недалёка.

(Паводле Клаўдзіі Каліны)

Засердава́ць — стаць сярдзітым, раззлавацца.
Страля́е лёд — *тут:* трашчыць лёд.
Падхапі́цца — ускочыць.

1. Чаму стаміўся Люты? Ці доўга ён лютаваў?
2. Што адбылося, пакуль Люты спаў? Што зрабіла Сонейка?
3. Хто разбудзіў лясных жыхароў?
4. Чаму падхапіўся Люты? Які месяц надыдзе за ім?
5. Ці спадабалася вам казка? Чым?
6. Ці былі вы ў зімовым лесе? Раскажыце пра свае ўражанні.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прымаўка

У цёплым кажушку — і маразы як жарт.

Люты і дзеці

Су-стрэ-ўшы Уз-дрыг-нуў
Спа-ло-ха-лі-ся Не-ша-вец-кае

Напужаць надумаў Люты,
на двары сустрэўшы дзетак.
Грозна дзьмухнуў:
— Ці абуты?
Ці вы ў цёплае адзеты?
Не спалохаліся дзеці:
— Паглядзі, як сонца свеціць!
Кроплі будзяць цішыню,
клічуць цёплую вясну.
— Дзе вясна? —
уздрыгнуў Люты.
— Я ж, здаецца, не абуты?
Адшукалі дзеці боты
нешавецкае работы.
Ён абуўся і пабег,
а за ім — мароз і снег.

(Паводле Расціслава Бензерука)

Нешаве́цкае рабо́ты ***(боты)*** — *тут:* казачныя, змайстраваныя не шаўцом.

1. Пра якія падзеі гэты верш? Сапраўдныя ці казачныя?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

2. Як Люты палохаў дзяцей? Ці спалохаліся яны?
3. Чаго спужаўся сам Люты? Раскажыце.
4. Як дзеці дапамаглі Лютаму?
5. Выразна прачытайце верш па ролях.

Прыказка

Прыйдзе люты — спытае, ці добра абуты.

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ

1. Пра якую пару года вы прачыталі творы?
2. Чаму дзеці любяць зіму? Назавіце дзіцячыя зімовыя гульні.
3. Успомніце твор «Зімовая азбука». Чаму ён вас навучыў?
4. Назавіце твор пра сапраўдных сяброў Алёнкі. Хто аўтар твора? Знайдзіце ў канцы падручніка па змесце.
5. З якіх вершаў вы даведаліся пра дзіцячыя гульні?
6. Раскажыце пра свае любімыя зімовыя забавы.
7. Пра які новы корм для птушак вы даведаліся? Звярніцеся да старонак 18—19.
8. Ці шмат кармушак вы падрыхтавалі? Дзе яны вісяць?
9. Колькі разоў на дзень вы сыплеце корм птушкам?
10. Які твор спадабаўся вам больш за ўсё?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ЖЫВЁЛЫ — НАШЫ СЯБРЫ

Каго як завуць?

Вет-ры-кам	Кры-ку-ном
Ня-суш-кай	Упар-тым

— Чаму цябе Ветрыкам завуць? — спыталіся ў жарабяткі.

— Я хутка бегаю, як вецер.

— А цябе Нясушкай за што?

— Я яйкі нясу.

— А за што цябе Крыкуном? — спыталіся ў пеўня.

— Я моцна крычу і людзей буджу.

— А цябе Упартым чаму?

— Не скажу! — адказала асляня і стукнула капытом па зямлі.

(Паводле Анатоля Клышкі)

Упа́рты — непаслухмяны, які робіць усё насуперак, па-свойму.

1. Якія жывёлы названы ў творы?
2. Чаму яны атрымалі такія мянушкі: Ветрык, Нясушка, Крыкун, Упарты? Складзіце адказы паводле ўзору:
   Жарабятка назвалі Ветрыкам. Яно бегае хутка, як вецер.
   Курачку назвалі ... .
   Пеўня назвалі ... .
   Асляня назвалі ... .
3. Прачытайце выразна. Выдзяляйце голасам пытанні і адказы.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Свойскім жывёлам часта даюць мянушку паводле колеру. Напрыклад, цялушка белага колеру. Яе назавуць Белкай. А шчаня рудога колеру атрымае мянушку Рыжык. А коцік чорнага колеру — Вугалёк.

Мая гаспадарка

Бу-рач-на-га Пры-ву-ча-на
Су-стра-каць Га-спа-дар-ку

Аднойчы кажа мне бабуля:

— Ідзі, Вова, стрэнь наша малачко.

Я бяру лусту хлеба ці жменю бурачнага ліста. І іду сустракаць нашу карову Белку. Яна так у бабулі прывучана. Сустрэць яе трэба чым-небудзь. А то міне двор і пойдзе па ўсёй вёсцы... Калі ж Белка не прыходзіць дадому, бабуля злуецца:

— Вось жа ўдалося малачко!

Але мяне не ашукаеш. Малако — значыць, карова! А карова — значыць, малако.

Сваю гаспадарку я ведаю.

(Паводле Алены Васілевіч)

Бура́чны ліст — лісце маладых бурачкоў.
Стрэць — сустрэць.
Мінýць — прайсці міма.
Лýста — скіба, кавалак хлеба.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Аб чым прасіла бабуля Вову?
2. Якім чынам Вова выконваў яе просьбу? Што ён браў з сабою для каровы?
3. Як бабуля злавалася на карову Белку? Прачытайце.
4. Які ўнучак у бабулі? Дапоўніце: *паслухмяны, … .*
5. Якія даручэнні даюць вам дома, у школе? Як вы іх выконваеце?

Жарт

— Дай, бабка, малачка.
— Дык карова не доена.
— Тады налівай смятаны!

Прымаўка

Даў кусочак — з каровін насочак.

За качкай ходзяць…

За качкай ходзяць …,
а за гускай — …,
за кароваю — …,
а за свінкай — … .

(Паводле Ніны Галіноўскай)

1. Падбярыце неабходныя словы. Для даведкі: *качаняты, бычок, гусяняты, парсючок.*
2. Хто чыя мама? Дапоўніце: *у качанят — качка, у гусянят — …, у бычка — …, у парсючка — … .*
3. Ці назіралі вы за свойскімі жывёламі? Як называюцца дзеткі сабакі і коткі? А казы і авечкі?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Храбры певень

Сып-люць Ча-ра-дою

Па падворку певень ходзіць,
за сабою курэй водзіць
і крычыць:
— Сюды! Сюды!
Як кіўне ён галавою,
сыплюць куры чарадою —
як адна бягуць туды.
А калі хто кур пужае,
певень грозна загукае:
— Хто такі там? Хто такі?

(Паводле Якуба Коласа)

Падво́рак — двор каля хаты, дома.
Чарада́ — чарга.
Загука́ць — падаць гучны голас.

1. Хто на падворку галоўны?
2. Як певень клікаў курэй?
3. Якім чынам ён пагражаў чужым? Прачытайце апошні радок грозна, як певень.
4. Як вы разумееце выраз *«сыплюць куры чарадою»*?
5. Чаму верш называецца «Храбры певень»?
6. Ці назіралі вы, як кормяць курэй? Як паводзіць сябе певень? Кідаецца на корм або назірае за парадкам?

Загадка

Не наезнік, а са шпорамі,
не будзільнік, а ўсіх пабудзіць.

П					

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гусак

Ба-бу-лі-ным	Неў-за-ба-ве
Хле-вуш-ком	Дзеў-ба-нуць
Ца-цач-ная	Ус-хліп-ваў
Стрэль-ба	Фі-зіч-ную

Аднойчы Рыгорка гуляў за бабуліным хлевушком. Ён будаваў пясчаны горад. За плячамі ў яго была цацачная стрэльба. А дарослыя займаліся сваімі справамі на двары.

Неўзабаве з-за хлевушка пачуўся крык:

— А-а-а-а!

Прыбегла маці.

— А-ёй-ёй... — пляснула яна рукамі.

Белы здаровы гусак паваліў Рыгорку і хацеў дзеўбануць яго.

— А-гы-ля!.. А-гы-ля!.. — прагнала маці гусака.

Пасля падхапіла Рыгорку на рукі:

— Ціха, сынок.

— Мамачка, скажы яму, хай у вырай ляціць. Не буду я з ім болей гуляць, — усхліпваў Рыгорка.

— Не, сыночак, не можа ён лётаць. А зазлаваў ён на цябе. Мусіць, таму, што ты ганяў гусянятак.

— Не ганяў я гусянятак...

— Бачыш, і вінтоўка табе не памагла, — маці паправіла за спінаю сына цацачную стрэльбу.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Трэба, сынок, быць смелым і дужым. Тады нічога не страшна...

Пасля гэтага Рыгорка стаў кожную раніцу рабіць фізічную зарадку. А таксама есці кашу і піць малако. Хоча сілы набрацца...

(Паводле Уладзіміра Ліпскага)

Неўзаба́ве — у хуткім часе, хутка.
Хлевушо́к — маленькі хлеў, збудаванне для свойскіх жывёл.

1. Дзе гуляў Рыгорка?
2. Што здарылася з хлопчыкам? Раскажыце.
3. Хто прагнаў гусака? Як мама крычала на яго?
4. Якім параіла мама быць Рыгорку? Прачытайце.
5. Што стаў рабіць хлопчык, каб набрацца сіл?
6. Прачытайце. Пакажыце, як хлопчык плача, а мама яго суцяшае.
7. Што б вы параілі Рыгорку? Як трэба абыходзіцца з гусянятамі?
8. Што вы робіце, каб набрацца сіл?

Загадка

Ідзе яна паважна,
шыпіць дужа страшна,
за пяткі чапае,
нос і лапы чырвоныя мае. *У, с, г, ь*

Жарт

Гнут-кая Ка-зля-ня-ты

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ну і гнуткая лаза! — вяжа венікі каза.
А карова ёй:
— Му-у, му-у, гэта венікі каму?
— Мэ-э, патрэбны мне самой.
— Будзеш парыцца зімой?
— Не, абед рыхтую дзецям —
казляняты любяць вецце.

(Паводле Ніны Галіноўскай)

Гну́ткі — які добра гнецца.
Ве́цце — галінкі.

1. Як вы зразумелі жарт?
2. Каму рыхтавала венікі каза?
3. Аб чым пыталася карова? Што яна падумала?
4. Прачытайце ўголас, каб усе адрознілі казу і карову. Хто мэкае, а хто мыкае?

Ма́шына мова і дзедава замова

Па-ста-рай-ся Па-ра-га-чы

Ко-ко-ко, пасядзі,
мне яечка знясі.
Гаў-гаў-гаў, прыбяжы,
на злую муху пабрашы.
Мяў-мяў-мяў, не ляжы,
мышка шкрабае ў дзяжы.
Му-му-му, не гуляй,
малака мне кубак дай.
І-го-го, пакатай —
на лужок, у поле, гай.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Рох-рох-рох, пастарайся,
у лужы болей не купайся.
Кра-кра-кра, падплыві,
сваё пёрка падары.
Ку-ку, ку-ку, не маўчы,
лічыць Машу навучы.
Га-га-га, парагачы,
разам з намі паскачы.
Ку-ка-рэ-ку, не праспі,
мяне ў садзік разбудзі.

(Паводле Уладзіміра Ліпскага)

Дзяжа́ — бочка для цеста.
Рагата́ць — гучна смяяцца.

1. Якія нязвыклыя словы ёсць у вершы? Чые гэта гукі — людзей ці жывёл?
2. Якіх жывёл называла Маша? Да поўніце: *ко-ко-ко — курыца, гаў-гаў-гаў — … .*
3. Чаму Маша так называла жывёл? Як вы лічыце, колькі ёй гадоў?
4. Прачытайце верш, замяняючы гукі жывёл іх назвамі. Замест *ко-ко-ко — курыца*, замест *гаў-гаў-гаў — сабака*, … .
5. Чытайце парамі так, як гавораць Маша і дзядуля.

Скорагаворкі

Клюйце, куры, крупы
навокал ступы.
Рабая курка клюе крупы.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Злодзей

Ага-ро-дзе Удзяч-на-сцю

У бабулі ў агародзе
пабываў сягоння злодзей.
Покуль стрэльбу дзед шукаў,
покуль боты абуваў,
зноў з’явіўся ў агародзе
з барадою белай злодзей.
Ён качан капусты з’еў
і з удзячнасцю глядзеў
на бабулю і на дзеда:
— М-э-э-э!
Я смачна паабедаў.

(Паводле Тадзіяны Кляшторнай)

1. Які «злодзей» пабываў у агародзе?
2. Што ён нарабіў, пакуль дзед збіраўся?
3. Як дзякаваў казёл бабулі і дзеду? Прачытайце.
4. Прачытайце выразна. Пакажыце, як павольна збіраўся дзед.
5. Па жаданні вывучыце верш на памяць.

Загадка

Як яе ні распранаеш,
ды няма канца і краю.
Не хапае і цярпення,
нібы ўся яна — з адзення.

К						

(Анатоль Зэкаў)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Бурачок і бычок

Вы-су-нуў-ся Схрум-стаў

Бурачок-дзівачок
высунуўся з градкі,
а бычок — за бачок,
схрумстаў без аглядкі.
Тут прыбегла Ала
і бычка прагнала:
— Ты сякі, ты такі!
Хай растуць буракі!

(Паводле Івана Муравейкі)

Схру́мстаць — *тут:* з'есці з апетытам, зжаваць.

1. Якая гародніна выросла на градцы?

2. Што зрабіў бычок? Складзіце словы з літар: *С, р, у, х, с, а, т, м, ў.*

3. Як Ала ўшчувала бычка? Прачытайце.

4. Як бы вы праганялі бычка? Прачытайце выразна і пакажыце рухамі.

5. Які гэта верш — жартоўны ці сур'ёзны?

Адгадайце словы. Дзе А, дзе Ы?

Легчы на правы б..чок.
Тупае рагаты б..чок.
За кароўкаю ідзе б..чок.
Бадаецца ўпарты б..чок.
У яблыка чырвоны б..чок.
У б..чка шарсцяны б..чок.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Каток

У мяне ёсць жвавы
шэранькі каток,
жэўжык, непаседа,
вечна скок ды скок!

Хвосцікам паводзіць,
гнецца ў дугу,
трэцца шэрым бокам
аб маю нагу.

(Паводле Алеся Жаўрука)

Жва́вы — шустры.
Жэ́ўжык — непаседа.

1. Апішыце знешні выгляд катка. Які ў яго характар?
2. Што любіць рабіць каток? Раскажыце.
3. Пакажыце, як ён скача, гнецца ў дугу.
4. Калі каток трэцца аб нагу? Калі раззлаваны ці задаволены?
5. Прачытайце верш выразна. Перадайце голасам, як гаспадар любіць ката.
6. А ў вас ёсць коцік? Што ён любіць рабіць?

Загадка

Вусаты,
хвастаты,
драплівы,
пухнаты...
Завецца Вуркот. Хто гэта? *К, т, о*

(Алена Церашкова)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дамок для Рэкса

Раз-мя-ра-лі Су-стра-ка-е

З татам дошкі габлявалі.
Размяралі, пілавалі —
і дамок сабаку Рэксу
мы прыгожы збудавалі.

Светлы ён, з акном дамок,
на падлозе — дыванок.
І цяпер мяне са школы
сустракае Рэкс вясёлы.
(Паводле Міхася Пазнякова)

Руле́тка — інструмент для замераў.
Габлява́ць — чысціць гэблем, рабіць гладкімі.

1. Каму рабілі дамок?
2. Што гаспадары рабілі з дошкамі? Якімі інструментамі карысталіся? Даведка: *рулетка, гэбель, піла.*
3. Які атрымаўся дамок? Апішыце яго з дапамогай малюнка.
4. Для чаго Рэксу паслалі дыванок? Ці любяць гаспадары сабаку?
5. Вывучыце верш на памяць.
6. Намалюйце свой дамок для Рэкса.

Скорагаворка

Пільшчыкі-пілавальшчыкі пілавалі піламі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Загадка

Не піла, не ела,
ні разу не прысела,
а ўсё пела і гула.
Папілавала дровы —
будзьце здаровы! *П, а, л, і*

(Васіль Вітка)

Безбілетная падарожніца

1

Да-во-дзі-ла-ся	Улад-ку-ец-ца
Тра-лей-бу-се	Без-бі-лет-ні-ца
Хва-ля-ва-ла-ся	Тра-лей-бус-ны
Пе-ра-бя-жыць	Ад-чы-ня-юц-ца

Жульцы часта даводзілася ездзіць з намі ў тралейбусе. Мы часам бралі яе з сабой на работу. Нават у госці.

У дарозе яна заўсёды вельмі хвалявалася. Доўга не магла ўседзець на адным месцы. То мне на рукі ўскочыць. То да гаспадыні перабяжыць. То ў Сярожы на каленях уладкуецца.

Аднаго разу кантралёр, калі правяраў білеты, пажартаваў:

— Безбілетніца! Таму і баіцца, каб не высадзілі, хвалюецца...

Неяк раніцай я пайшоў у магазін. Па хлеб. І Жулька за мной увязалася. Перайшлі на другі бок вуліцы. А тут якраз тралейбусны прыпынак. І тралейбус падыходзіць. І дзверы адчыняюцца.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Не паспеў я і вокам міргнуць, а Жулька ўжо ў тралейбусе.

Уладкава́цца — зручна ўсесціся.

1. Хто такая Жулька?
2. Ці часта яна ездзіла з гаспадарамі? У якім транспарце?
3. Як яе назваў кантралёр?
4. Што здарылася па дарозе ў магазін?
5. Як вы разумееце *«не паспеў і вокам міргнуць»*? Гэта хутка ці павольна?
6. Чым тралейбус адрозніваецца ад аўтобуса?

2

На-су-страч Жуль-чы-ным

Пабег я за ёй, але дзверы перад самым носам зачыніліся. І тралейбус рушыў далей.

Кінуўся я спачатку ўслед. Ды дзе там! Хіба дагоніш... Ну, думаю, усё. Бывай, Жулька!.. Як я зараз дадому вярнуся? Што скажу?

Сумна мне стала. І горка. Нават пра хлеб забыўся. Брыду сабе па вуліцы да наступнага прыпынку. Аж бачу — ляціць мне насустрач белы пухавы камяк. І вішчыць гучна, на ўсю вуліцу, Жульчыным голасам.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Жулька!

А тая з радасці як скочыць з ходу мне на грудзі. І лізь сваім гарачым ружовым язычком у нос. Падхапіў я яе на рукі, прыціснуў да шчакі.

Ідуць людзі. Глядзяць на нас. Дзівяцца. Ну і нях хай сабе!

А хлеба ў той дзень мы так і не прынеслі.

(Паводле Артура Вольскага)

Брысці́ — сумна крочыць.
Ру́шыць — паехаць.

1. Куды заскочыла Жулька?
2. Як адчуваў сябе гаспадар, калі Жулька паехала без яго?
3. Што зрабіў разумны сабака? Як ён паказваў сваю радасць?
4. Як вы ўяўляеце *«белы пухавы камяк»*? Пра каго гэта?
5. Ці ўзрадаваўся гаспадар? Як ён паказваў сваю радасць?
6. Прачытайце выразна. Пакажыце сумны і радасны настрой гаспадара.
7. Ці ёсць у вас дома сабака? Як ён паказвае радасць?

Тралейбус — гэта электрычны транспарт. Ён бярэ сілу ад электрычных правадоў і таму едзе. Ён не забруджвае паветра дымам і копаццю. Людзі і расліны могуць лёгка дыхаць.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Што за інтэрнат?

Не-звы-чай-ны
Ін-тэр-нат

Дзі-віц-ца
На-дзі-віц-ца

Незвычайны інтэрнат:
тут звяроў і птушак шмат.
Ходзіць, дзівіцца Ігнат
з тыгра,
з малпы,
з лісянят,
з чаплі,
страуса,
ільва.
Ёсць тут зебра,
воўк,
сава...
Не надзівіцца Ігнат.
Што за дзіўны інтэрнат?

(Паводле Яўгена Хвалея)

Інтэрна́т — *тут:* месца, дзе знаходзяцца жывёлы і птушкі.

1. З чаго дзівіўся Ігнат?
2. Якіх звяроў ён там убачыў? Прачытайце.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Што за дзіўны інтэрнат? Складзіце яго назву з літар: *З, я, в, ы, р, е, ц, н.*

4. Як вы думаеце, ці бываў раней Ігнат у звярынцы?

5. А вы былі ў звярынцы (заапарку)? Ці ў цырку? Якіх звяроў вы там бачылі?

Хто пра што...

Зяр-ня-так Зда-га-да-лі-ся

Кот, казёл,
сабачка, пеўнік
на адным двары жылі.
Вось сабраліся
ўсе разам
і размову пачалі:
— Малачка мне б, мышку.
— А мне б сена крышку.
— Мяса б мне багата.
— Ну, а мне б зярнятак.
Здагадаліся вы, пэўна,
хто пра што з іх гаварыў.

(Паводле Авяр'яна Дзеружынскага)

1. Хто жыў на адным двары? Назавіце.

2. Хто любіў малачко?

3. А хто — сена?

4. Каму хацелася багата мяса?

5. А хто прасіў зярнятак?

6. Прачытайце верш выразна. Пакажыце галасы жывёл.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Рагуля-малакуля

Ма-ла-ку-ля	Ка-ню-шын-кай
Маль-він-ка	Ле-бя-дою

— Бачыш, бабка,
вунь рагуля,
прыйшла з пашы
малакуля.

— Накармі яе,
Мальвінка,
свежай траўкай,
канюшынкай,
а яшчэ і лебядою,
каб дала нам сырадою.

— Добра...
Накармлю, бабуля,
я рагулю-малакулю.

(Паводле Авяр'яна Дзеружынскага)

Сырадóй — свежае малако.

1. Як ласкава называюць карову? Чаму?
2. Чаму Мальвінка называла яе *«малакуля»*? Да якога слова падобна *малакуля*?
3. Чым будзе частаваць карову Мальвінка?
4. Прачытайце па ролях парамі. Уявіце сябе Мальвінкай і бабуляй. Памяняйцеся ролямі.
5. Якія даручэнні даюць вам дома? Ці кармілі вы свойскіх жывёл?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Жарт

Бабуля пытаецца:
— Унучачка, што трэба рабіць, каб малако не закісла?
— Трэба хуценька яго выпіць!

Загадка

Днём на пашы, на траве,
ноччу — у сваім хляве.
Штосьці нам усім дае —
моцны той, хто яго п’е.

К					

(Алена Велянцэвіч)

Воўк і ліска

Воўк пытае ліску:
— Дзе была?
— Я лавіла пеўня ля сяла.
— Дзе ж ты дзела пеўня?
— З’ела ля куста.
— А чаго ж ты, ліска, без хваста?
— Хвост жа мне мой певень адарваў.
— Чуў я, чуў, брахаў ён:
«Гаў-гаў-гаў!».

(Паводле Авяр’яна Дзеружынскага)

1. Назавіце герояў казкі.
2. Хто пытаўся, а хто адказваў?
3. Які голас у ліскі? Які ў ваўка? Прачытайце выразна.
4. Чым выхвалялася ліса? Ці мог певень адарваць лісе хвост?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Ці паверыў воўк лісе? Што ён сказаў? Прачытайце.
6. Што адбылося на самай справе? Падумайце.
7. Падрыхтуйце пастаноўку гэтай казкі.

Прымаўка

І хітры ліс у пастку трапляе.

Гаспадар пушчы

1

Фыр-кан-нем	Па-са-джа-ная
Пра-бі-ра-ец-ца	Му-ску-лі-стыя
Хі-ста-юц-ца	Ма-гут-на-сцю
Ас-вет-ле-ны	Вы-гля-да-юць

Трашчыць галлё. З шумам і фырканнем прабіраецца праз гушчар нешта вялікае і дужае. Хістаюцца маладыя бярозы. Пад напорам цяжкага цела гнецца да зямлі густы падлесак.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гэта зубр. Вось ён выходзіць на лясную паляну. Схіліўшы магутную галаву, ён спыняецца, асветлены сонцам.

Я ўглядваюся ў лясного волата. Не часта даводзіцца бачыць такое відовішча. Увесь ён аброс густой кучаравай шэрсцю цёмна-каштанавага колеру. У яго вялікая, нізка пасаджаная галава з чорнай барадой. І шырокія мускулістыя грудзі. Зубр здзіўляе сваёй веліччу і магутнасцю. Высокая шыя гарбом узвышаецца над спінаю.

Шыя, грудзі, добрая палова спіны густа пакрыты цёмнай калматай грывай. Звісае гэта грыва над шырока пастаўленымі, тоўстымі і кароткімі нагамі.

Пярэдняя частка яго моцнага тулава цяжкая і масіўная. Яна здаецца непамерна развітой у параўнанні з задняй часткай. Задняя пакрыта больш кароткай і светлай поўсцю. Заднія ногі выглядаюць больш высокімі і тонкімі, чым пярэднія. Хвост — як у звычайнага быка, але кароткі і тоўсты.

Гушча́р — непраходны густы лес.
Падле́сак — маладыя дрэўцы і кусты.
Во́лат — асілак, велікан.

1. Пра каго гэты тэкст? Чаму зубра завуць волатам?
2. Разгледзьце малюнак. Раскажыце пра зубра па пытаннях: *Якога ён памеру? Якая ў яго галава? А шыя, спіна і ногі? Чым пакрыта тулава зубра?*
3. Да каго са свойскіх жывёл падобны зубр?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

2

!	Мі-ма-хо-дам	Ме-дзве-дзя-нят
	Кал-ма-тых	Па-слух-мя-на

У ясным і ціхім лясным паветры добра чуваць роўнае і глыбокае дыханне вялікай жывёлы.

Пастаяўшы крыху на месцы, нібы ў задуменні, зубр рушыць далей. Па дарозе абрывае мімаходам маладыя галінкі ясеня.

Следам за ім выходзіць на паляну ўвесь статак. Тут і маладыя зубры, і падлеткі. І дарослыя зубрыцы з цялятамі. Цяляткі падобныя на буйны́х, калматых медзведзянят.

Мінуўшы лясную паляну, зубр выходзіць на дарогу. Ён спыняецца зноў. І, пастаяўшы крыху, нібы разважаючы, ідзе па дарозе. За ім паслухмяна цягнуцца астатнія. Яшчэ хвіліна — і ўсе зубры знікаюць за высокімі дрэвамі на павароце. Узнятыя клубы пылу нагадваюць здалёку невялікі статак звычайных кароў.

(Паводле Віталя Вольскага)

Падле́ткі — *тут:* маладыя жывёлы.

1. Хто выводзіў статак на паляну?
2. Пакажыце на малюнку маленькае цялятка і падлетка.
3. Да каго падобныя цяляты? Прачытайце.
4. Хто галоўны ў статку? Як вы здагадаліся?
5. Як рухаецца зубр? Хутка ці павольна?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

6. Як трэба чытаць? Хутка ці павольна? Прачытайце тэкст выразна.

7. Што вы даведаліся пра зубра? Раскажыце сваімі словамі бацькам або сябрам.

Загадка

Па лясах блукае статак
валатаў і немаўлятак.
Гэта пушчы спадары —
белавежскія *з..б..ы*.

(Васіль Жуковіч)

Белавежа

Бе-ла-веж-ская	Па-ла-са-ці-каў
Раз-га-лі-стыя	Шча-цін-нем
Аба-ра-ніц-ца	Ад-га-ду-юць

Самая славутая ў Беларусі пушча. Вы ведаеце — якая? Белавежская. Яна на захадзе нашай рэспублікі. На мяжы з Польшчай. А самая галоўная ўкраса пушчы — белавежскі зубр. Гэта цар звяроў, якія здаўна насяляюць пушчу. Ён самы вялікі і дужы.

Зубр

Алень

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Лось

Дзік з парасятамі

Можа паваліць рагамі дрэва. Разбурыць сцяну з бярвёнаў. Можа нават на лясной дарозе спыніць матацыкл і машыну. Але ён рэдка гэта робіць. Зубр — рахманы і спакойны звер. Калі яго не чапаюць.

А вось алень. У яго на галаве рогі. Як разгалістыя галіны з вострымі сукамі. Хто скажа, што гэта не магутная зброя? Ёю можна абараніцца і адагнаць ад сваёй сямейкі любога ворага.

Дужыя прыгожыя ласі. Каб умелі гаварыць, што б яны сказалі нам?

— Мы таксама гаспадары пушчы. У рагах і ў нагах у нас вялікая сіла, а завёмся мы — ласі.

— А мы — дзікі́, — сказалі б нам смешныя і невялічкія паласатыя парасяткі. Так, яны з пароды свіней. Толькі дзікія. Таму і завуць іх — дзікі. Побач з малымі іх бацька — страшны і грозны, з доўгім лычом. У яго пашчы два вострыя, як нажы, іклы. Ён вартуе сваю сямейку — чацвёра маленькіх паласацікаў. Калі яны падрастуць, палосы знікнуць. Дзеці стануць як іх бацькі. Укрыюцца бурым шчаціннем. І адгадуюць сабе таксама вострыя іклы.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Пушчу ахоўваюць людзі. Тут звяры ведаюць, што чалавек — іх сябар і заступнік.

(Паводле Уладзіміра Караткевіча)

Пу́шча — вялікі лес, дзе не гаспадараць людзі.
Украса́ — упрыгожанне, краса.
Рахма́ны — бяскрыўдны, незласлівы.
І́клы — клыкі, доўгія вострыя зубы.

1. Якая пушча самая славутая ў Беларусі?
2. Назавіце Белавежскую пушчу адным словам: *Б, а, л, е, в, а, ж, е.*
3. Разгледзьце малюнак. Якія звяры жывуць ў Белавежы?
4. Каго называлі царом звяроў?
5. Як выглядаюць алені? А ласі? Апішыце па фотаздымках.
6. Чым жывёлы абаранялі сваю сям'ю? Даведка: *рогі, капыты, ногі, іклы.*
7. Чаму дзік названы страшным і грозным?
8. Прачытайце выразна. Чаму гэты твор трэба чытаць павольна?

Загадкі

Полем бег, у лесе знік,
іклы, лыч — завецца *дз..к*.

Загрукоча, грымне штось,
рогі так скідае *л..сь*.

(Дзед Бялын)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ

1. Успомніце, пра якіх свойскіх жывёл вы чыталі.
2. Што вы даведаліся з верша «Хто пра што»? Чым кормяцца свойскія жывёлы?
3. У якім творы гусак прымусіў Рыгорку набірацца сіл?
4. Што здарылася з Жулькай у творы «Безбілетніца»?
5. Успомніце, які інтэрнат здзівіў Ігната. Як называецца твор? Знайдзіце яго ў канцы падручніка па змесце.
6. Перакажыце казку «Воўк і ліса» сваімі словамі.
7. Хто рабіў дамок для Рэкса? Перачытайце верш.
8. Каго называюць гаспадаром пушчы? Да каго ён падобны?
9. Што вы даведаліся з твора «Белавежа»? Пра якіх звяроў можаце расказаць?
10. Чым падобныя творы «Рагуля-малакуля» і «Мая гаспадарка»?
11. Знайдзіце ў раздзеле творы Авяр'яна Дзеружынскага. Гэта вершы ці апавяданні?
12. Які твор з гэтага раздзела вам спадабаўся больш за ўсё?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ПАЧЫНАЕЦЦА ВЯСНА З МАМІНАГА СВЯТА

Ажылі пралескі

Замець не гуляе,
і мароз аслаб.
Раніцай чутно:
кап... кап... кап...

На паляне ціхай
у густым бары
ажылі пралескі —
весніх дзён сябры.

(Паводле Паўлюка Пранузы)

За́мець — *тут:* завіруха, мяцеліца.
Бор — сасновы, яловы лес.
Ве́сніх дзён сябры́ — *тут:* сябры вясны.

1. Прачытайце верш. Што адбывалася ў прыродзе?
2. Калі з'явіліся пралескі? Дзе яны растуць?
3. Верш трэба чытаць ціха альбо гучна? Прачытайце выразна.
4. Ці бачылі вы пралескі ў прыродзе? Якога яны колеру?
5. Намалюйце пралескі.

Загадка

Узімку цыбулінка спіць-спачывае.
Прачнецца — і кветкі на волю пускае.
Хай снег, хай мароз — у вясновым падлеску
красуюць блакітныя кветкі — *пр..ле..кі*.

(Алена Церашкова)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Маміны рукі

Маміны рукі самыя лепшыя:
няньчылі, гушкалі, лашчылі першыя.
Маміны рукі сардэчныя, смелыя,
маміны рукі самыя ўмелыя.
Маміны рукі — рукі шчаслівыя,
маміны рукі заўсёды цярплівыя.
Маміны рукі самыя светлыя,
маміны рукі самыя ветлыя.

(Паводле Паўлюка Пранузы)

Ве́тлыя — *тут:* ласкавыя, прыветныя.

1. Каму прысвечаны верш?
2. Якія словы паўтараюцца?
3. Чаму маміны рукі самыя лепшыя?
4. Якія маміны рукі? Прачытайце.
5. Вывучыце верш на памяць. Раскажыце сваёй маці або бабулі.

Прыказка

Пакуль маці любіць, лёс дзіця галубіць.

Вясна ідзе

За-свя-ці-ла	За-жму-рыў-ся
Пра-та-лін-кі	Зе-ля-ней-шыя
На-бу-ха-юць	Шэ-рань-кую

Засвяціла ў небе сонейка.
— Дзінь-дзінь-дзінь, — зазвінелі льдзінкі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Забулькалі, заспявалі пад снегам ручаі. На старой таполі замахаў крыламі чорны грак.

«Убачыў грака — вясну сустракай», — кажа прымаўка. Снег у полі пацямнеў, набрыняў і асеў. На ўзгорках чарнеюць праталінкі. У лесе на дрэвах набухаюць пупышкі. Весела звіняць сінічкі на голым вецці.

Звонка грукае дзяцел на старой асіне. Грукаў, грукаў — аж разбудзіў мядзведзя. Вылез мішка з бярлогі. Пачухаў за вухам. Зажмурыўся ад сонца. І зароў на ўвесь лес: «Вясна ідзе!..»

Выскачыў з-пад кусціка маленькі зайчык. Працёр лапамі вочкі і здзівіўся. Лес пацямнеў. Елачкі зелянейшыя сталі. Нават маму сваю не пазнаў. Скінула яна свой белы кажушок. Адзелася ў шэранькую світку. І скубе на праталінцы зялёную траўку.

Наўкола ўсё булькае, звініць, дзінькае і гукае: «Вясна ідзе-е-е!»

(Паводле Валерыя Кастручына)

Набрыня́ць — напоўніцца вадою.
Прата́лінкі — плямы, дзе растаў снег.

1. Якая пара года настала?
2. Як сталі паводзіць сябе птушкі? Прачытайце.
3. Якім чынам паводзіў сябе мядзведзь?
4. Чаму маленькі зайка не пазнаў сваю маму? Знайдзіце ў тэксце.
5. Якія прыметы вясны апісаны? Дапоўніце: *сонейка засвяціла, ручаі ..., льдзінкі ..., снег ..., праталінкі ..., дрэвы ..., лес ..., пупышкі ...* .

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

6. Прачытайце тэкст ланцужком. Чытайце павольна, як казку.

7. Растлумачце: *«Убачыў грака — вясну сустракай»*.

Жарт

Дзень шпаку даказваў грак,
што ў яго чарнейшы фрак.
Ды не мог згадзіцца шпак,
што ў яго святлейшы фрак.
А ў пяску як паваляліся —
болей птушкі не спрачаліся.

(Анатоль Зэкаў)

Маміна свята

Ус-мі-ха-ец-ца Па-чы-на-ец-ца

Вельмі рада ўся сям'я
ў раніцу такую.
Падышоў
да мамы я
і кажу:
— Віншую...
Усміхаецца яна,
аж святлее хата.
Пачынаецца вясна
з мамінага свята.

(Паводле Артура Вольскага)

1. Назавіце ўсе вясновыя месяцы.

2. З якога свята пачынаецца вясна?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Чаму маму віншавалі раніцай?
4. Каго вы віншуеце 8 Сакавіка? Якім чынам? Раскажыце.
5. Вывучыце верш на памяць. Раскажыце яго маме (бабулі, сястрычцы).

Пчала

Рана-раненька
пчала
пакідала вулей,
заспявала-загула,
каб усе пачулі:
— Жу-жу-жу,
жу-жу-жу,
я без справы
не сяджу,
жу-у!

Палячу я
на лужок,
потым —
на палетак.
І збяру
духмяны сок
самых лепшых кветак.
Жу-жу-жу,
жу-жу-жу,
я над кветкамі кружу,
жу-у!..

(Паводле Артура Вольскага)

Палéтак — поле.

1. Калі пчала пакідала вулей? Прачытайце.
2. Куды яна ляцела так рана? Што хацела рабіць?
3. Якая песенька ў пчалы? Прачытайце.
4. Што робіць пчала з духмянага соку — нектару?
5. Ці падабаецца вам мёд? Які ён на смак? Якога ён колеру? Густы ці вадкі?

Прымаўка

Адна пчала мёду ў вулей не наносіць.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Загадка

Праляцела, як страла.
У вулей несла мёд *п..а..а*.

Май

Ура-чы-ста
Ад-зна-чае
Па-лі-чыць
Пе-ра-мо-гаю

І прыгожы, і вясёлы
мой любімы месяц май.
Адышлі даўно трывогі.
І ўрачыста кожны год
Дзень Вялікай Перамогі
адзначае наш народ.

Чуеш выбухі салюта?
Палічыць іх паспявай.
Перамогаю славуты
мой любімы месяц май.

(Паводле Артура Вольскага)

1. Якім паказаны ў вершы месяц май?
2. Якое свята адзначаюць у маі салютам? Прачытайце.
3. Ці даводзілася вам бачыць салют у Дзень Перамогі? Раскажыце пра свае ўражанні.
4. Ці былі ў вашай сям'і ўдзельнікі вайны? Спытайцеся ў дарослых. Што вы даведаліся?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Шпак

На бярозцы пад акном
я шпаку прыладзіў дом.
Толькі адысці паспеў —
шпак адразу прыляцеў.
Дом утульны аглядае,
песню весела спявае.
У шпака ёсць у двары
вельмі добрыя сябры.

(Паводле Тадзіяны Кляшторнай)

1. Што прыладзіў шпаку хлопчык? Збярыце слова з літар: *Ш, а, п, о, к, ў, я, н.*
2. Ці спадабаўся дом шпаку? Як вы здагадаліся?
3. Выразна прачытайце верш. З якім настроем вы будзеце чытаць?
4. Дзе вы бачылі шпакоўню? Ці майстравалі вы яе з дарослымі? Раскажыце.

Шпакі харчуюцца шкоднымі насякомымі. Таму дбайныя гаспадары размяшчаюць шпакоўні ў садзе і гародзе. Шпакам — домік, а раслінам — карысць.

Прылёт птушак

Чар-не-юць	Срэ-бра-ным
Сцяг-ну-лі-ся	Жа-ва-ра-нак

Ціхая раніца. Сонейка толькі што ўзышло. У полі ляжыць снег. Толькі ўзгоркі чарнеюць. Лужынкі

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

за ноч сцягнуліся лядком. Але ўжо чуваць вясну. І ўсё выглядае па-вясновaму.

Выйшаў Ясь на двор. Весела яму. Прыгрэе зараз сонца. Добра будзе на дварэ.

Во, чуеце? Нешта зазвінела ў небе. Звініць тонкім срэбраным званочкам. Так хораша, так міла — душа замірае! Ясь прыслухаўся. Не відаць нічога. А ў небе разліваецца тоненькая песенька.

Гэта жаваранак! І так весела Ясю. Здаецца, каб можна было, пацалаваў бы мілую птушачку...

Рады Ясь, што першы пачуў жаваранка. Ён пабег хваліцца сваім сябрам. Дзеці выходзілі на двор слухаць першую песню вясны. І ім было весела...

(Паводле Якуба Коласа)

Сцягну́ліся — *тут:* пакрыліся.

1. Які час сутак апісаны ў тэксце?
2. Што за настрой быў у Яся?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Чыю песеньку пачуў хлопчык? Чаму ён не бачыў птушачку?

4. Якія пачуцці ў яго выклікала песенька?

5. Як вы разумееце выраз *«так міла — душа замірае»*?

6. Каго паклікаў хлопчык, каб слухаць жаваранка?

7. Вам даводзілася чуць песню жаваранка? Паслухайце птушыныя песні ў прыродзе, на ўроках музыкі і спеваў.

Заклічка

Жавароначкі, прыляціце!
Вясну красную прынясіце,
каб сонейка засвяціла,
каб снег белы растапіла!

Прыказка

Для ўсякай птушкі сваё гняздо міла.

Мурашкі

Пра-ца-ві-тая	Па-паў-зуць
Вы-паў-зла	Па-па-дзец-ца
Ра-ман-та-ваць	Па-ва-ла-куць

Веснавое сонейка сагрэла мурашнік. Ён узімку быў засыпаны снегам. Пачула цяпло працавітая мурашка. Выпаўзла яна на сонейка. За ёю выпаўзла другая, трэцяя.

Вось ужо іх цэлая тысяча грэецца на сонцы. Пагрэліся яны — і зараз жа за работу. Давай рамантаваць сваю хату.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Пройдуць яшчэ два-тры дзянькі, папаўзуць мурашкі ў лес. Будуць збіраць кавалачкі хвоек, смолку. А пападзецца ім на дарозе жук або хрушч, возьмуцца яны за яго. Павалакуць да сваёй хаты.

Працавітыя мурашкі!

(Паводле Якуба Коласа)

Хрушч — майскі жук.

1. Што разбудзіла мурашак?
2. Чым заняліся мурашкі, як сагрэліся?
3. Каго мурашкі павалакуць у мурашнік? Прачытайце.
4. Хто большы — мурашка ці хрушч?
5. Адна мурашка можа пацягнуць хрушча? А калі іх шмат?
6. Якіх людзей называюць *«працавіты, як мурашка»*? Вы ведаеце такіх людзей? А вы самі працавітыя ці часам гультаяватыя?

Шпак

Шпа-коў-ню	Су-стра-каць
Вы-ходзь-це	Рас-цві-туць

Сёння раніцою
тут з'явіўся шпак,
сеў ён на шпакоўню
і спявае так:
«Вы выходзьце, дзеткі,
сустракаць вясну!
Устала ўжо прырода
з зімовага сну.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

На лугу ўжо скора
кветкі расцвітуць,
і над імі пчолкі
звонка загудуць».

(Паводле Янкі Журбы)

1. Хто прыляцеў да шпакоўні?
2. Якую песню спяваў шпак? Прачытайце.
3. Ці бачылі вы шпакоў? Ці чулі іх песні?
4. Паслухайце песні гэтых птушак у прыродзе ці на ўроках музыкі і спеваў.

Скорагаворка

Спакойна шпакоўню ціхую
шукае шпак са шпачыхаю.

(Рыгор Барадулін)

Пралеска

То-нень-кую	Уз-дых-ну-ла
На-ра-джэн-нем	На-ды-хо-дзіць

Белыя бярозы
спалі на ўзлеску,
а сваю галоўку
ўзняла пралеска.

Тоненькую ножку
з-пад пярыны белай
на зямлю пралеска
ставіла нясмела.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А снягі наўкола —
ні канца, ні краю.
Страшна стала кветцы:
— Я адна — жывая!

Кажа зверху сонца:
— Зорачка лясная,
з новым нараджэннем
я цябе вітаю!

Белыя бярозы
разам зашапталі:
— Мы цябе, пралеска,
усю зіму чакалі.

І старая елка
голасна ўздыхнула:
— Вясна надыходзіць,
а зіма мінула.

(Паводле Веры Вярбы)

1. Якая кветка выросла з-пад снегу?
2. Што азначае выраз *«з-пад пярыны белай»*?
3. Чаму кветачцы стала страшна? Што ўбачыла пралеска вакол сябе?
4. Як сонца назвала пралеску? Да чаго падобная кветка?
5. Якім чынам падтрымалі пралеску бярозы? Прачытайце.
6. Аб чым уздыхнула старая елка?
7. Як трэба чытаць словы маленькай пралескі? А як — словы бяроз, сонца, елкі?

Пралеску ў Расіі называюць падснежнікам. У Англіі — снежнай кропелькай. А ў Германіі — снежным званочкам. У веснавой кветкі пяшчотныя назвы.

Песня ручая

На-прад-вес-ні Жаў-ру-коў

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Бег вясёлы
ручаёк.
Бег, спяшаўся
праз лясок.
Бег па лузе,
між пагоркаў...

Бег ён хутка
напрадвесні
і збіраў дарогай
песні:
салаўёў, і жаўрукоў,
і сінічак, і шпакоў.

(Паводле Лявона Шырына)

Напрадве́сні — у пачатку вясны, ранняй вясной.
Жаўруко́ў — жаваранкі.

1. Дзе выбіраў сабе дарогу ручаёк? Прачытайце.
2. Чые песні збіраў ручаёк? Якія з названых птушак вам ужо вядомыя?
3. Ці назіралі вы вясной за ручайкамі? Раскажыце.
4. Уявіце сябе жвавым ручайком. З якім настроем трэба чытаць гэты верш?
5. Па жаданні вывучыце верш на памяць.
6. Зрабіце з дарослымі папяровы караблік. Паспрабуйце пусціць яго плыць па ручаіне. Паназірайце, ці хуткі ручаёк.

Народная прымета

Красавіцкі ручай зямлю будзіць.

Зямля прачынаецца

Ле-таш-няе	Пры-кмет-ныя
Пры-гледзь-ся	Стру-мень-чы-кі

Сяргейка саскочыў з ганка. І пабег па сцяжынцы, што вядзе ў сад.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Там хлопчык убачыў дзядулю. Ён грабаў леташняе лісце.

— Навошта ты гэта робіш? — спытаў Сяргейка.

— Трэба, унучак, — адказаў дзед. — Збяром лісце — зямлі лягчэй дыхаць будзе. Яна ж цяпер пасля зімы прачынаецца.

Ніколі Сяргейка не чуў, што зямля дыхае. Мусіць, дзядуля жартуе.

— Як жа яна дыхае?

— А ты прыгледзься, — сказаў дзед. — Тады і ўбачыш.

Сяргейка паглядзеў у адзін бок, у другі. У раніш-ніх промнях сонца падымаліся ледзь прыкметныя струменьчыкі пары.

— Бачу, бачу! — радасна закрычаў хлопчык.

(Паводле Паўла Ткачова)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ле́ташні — мінулагодні.

1. Куды пабег Сяргейка?
2. Што рабіў дзядуля ў садзе?
3. Што здзівіла Сяргейку? Ці ўбачыў хлопчык *«дыханне»* зямлі?
4. Якая пара́ года была на дварэ? Здагадайцеся.
5. Што робяць людзі вясной? Што вам давялося бачыць?
6. Што вы рабілі самі вясенняй парой?
7. Разам з дарослымі паназірайце змены ў прыродзе вясной.

Леташняе лісце згрэбаюць, каб прарасла маладая трава. Гэтае лісце нельга паліць. Таму што маладыя дрэвы і парасткі загінуць у агні. Можа загарэцца і чалавечае жытло.

Каб вясна хутчэй настала

Ад-ліж-ны Па-двор-ка

Растае́ адліжны снег.
Ручаёк бяжыць з падворка.
І сягоння не для ўцех
шуфлік свой узяў Рыгорка.

Сонца дзівіцца здалёк,
а хлапчук працуе дбала —
носіць снег у ручаёк,
каб вясна хутчэй настала.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ручаёк смялей пабег.
Сонца побач, на пагорку,
плавіць, плавіць, плавіць снег,
памагаючы Рыгорку.

(Паводле Міколы Маляўкі)

Адлі́жны — *тут:* падталы.
Шу́флік — савочак.
Дба́ла — *тут:* старанна, дбайна.

1. Пра якую пару года гаворыцца ў вершы?
2. Што рабіў Рыгорка? Прачытайце другі слупок.
3. Як вы лічыце, якога ўзросту Рыгорка?
4. Ці правільна дзейнічаў хлопчык? Што б вы яму параілі?
5. Назавіце вясенніе месяцы. Які першы месяц вясны? А які апошні?
6. Рыгорка дапамагаў надысці вясне. Успомніце, які хлопчык дапамагаў восені.

Вясной людзі працуюць у садзе. Яны згрэбаюць снег пад дрэвы. Снег ад сонца растае. І дрэвы самі сабой паліваюцца. Тады яны лепш цвітуць. І бывае добры ўраджай.

Вясновыя гукі

Пра-сві-шчы	За-сві-стаць

Пэўна, вы вясною чулі,
як на дрэве, на суку

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

кліча на ўвесь лес зязюля:
— Ку-ку! Ку-ку!
Прасіў шпак вераб’я:
— Прасвішчы, браток, як я.
Верабей — і так і сяк —
не, не ўмее ён, як шпак.
Не пад сілу вераб’ю
засвістаць: фію, фію!

(Паводле Васіля Віткі)

1. Чые галасы чуюцца ў прыродзе вясною? Пакажыце, як кукуе зязюля.
2. Аб чым прасіў шпак вераб’я? Ці здолеў верабей прасвістаць?
3. Пакажыце, як свішча шпак.
4. Успомніце, якая птушка пяе чужымі галасамі. Складзіце з літар слова: *Д, з, о, р, д.*
5. Правядзіце пальчыкам ад назвы да голасу птушкі.

Верабей	*чэ-чэ-чэ*
Варона	*чык-чырык*
Сарока	*гулі-гулі*
Голуб	*кар-кар*

6. Паслухайце з сябрамі галасы зязюлі, вераб’я, шпака. Назавіце, хто які голас падае.

Народныя прыметы

Жаваранак прылятае на праталіну,
шпак — на прагаліну,
жораў — з цяплом,
ластаўка — з лістом.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Клекатун

У гняздзе на дрэве
каля нашай хаты
пасяліўся бусел —
клекатун цыбаты.
Устае да сонца,
лётае, клякоча,
ежу сваім дзеткам
носіць аж да ночы.

(Паводле Авяр'яна Дзеружынскага)

Цыба́ты — даўганогі.
(Устае́) да со́нца — *тут:* устае вельмі рана, да ўзыходу сонца.

1. Хто пасяліўся на дрэве?
2. Калі прачынаецца бусел? Чаму? Прачытайце апошнія радкі.
3. Ці можна назваць бусла шчырым працаўніком?
4. Як выглядае бусел? Апішыце птушку.
5. Як вы лічыце, чаму бусла называюць клекатун?
6. Як называюць птушанят буслі́хі, шпачыхі, сарокі, вароны? Падказка: *...-няты*.
7. Вывучыце верш на памяць.

Бусел — сімвал Беларусі. Пра нашу краіну кажуць «Зямля пад белымі крыламі». Беларускі часопіс для маленькіх дзяцей называецца «Буся». Яго галоўны герой — бусляня.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Сустрэча сяброў

Падляцеў клекатун.
Ногі звесіў на ляту.
Апусціўся на пень:
— Добры дзень!
І пачуў у адказ:
— Добры дзень!
— Добры дзень!

(Паводле Авяр'яна Дзеружынскага)

1. Хто ў вершы *клекатун*?
2. Як вітаўся бусел і што чуў у адказ?
3. Ці назіралі вы за буслами? Раскажыце, дзе вы іх бачылі.
4. Прачытайце выразна верш. Павітайцеся адно з адным.

Народная прымета

Дзе бусел — там і шчасце.

Казёл і капуста

За-ска-ра-дзіў Па-хрум-стаў

Градзу́ казёл рагамі
вясной заскарадзі́ў,
купіў расаду ў краме —
капусту пасадзіў.
Чаму ж не выросла
капуста?
Расаду сам казёл
пахрумстаў.

(Паводле Анатоля Зэкава)

Заскарадзі́ць — *тут:* узрыхліць, падрыхтаваць зямлю да пасеву.
Кра́ма — магазін.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Пахру́мстаў — *тут:* з’еў.

1. Як думаеце, гэта выдуманая ці сапраўдная гісторыя?
2. Што пасадзіў казёл? Ці можа казёл саджаць капусту?
3. Чым ён узрыхліў грады?
4. Чаму не выросла капуста? З чаго яна вырастае?
5. Раскажыце гісторыю сваімі словамі.

Жарт

— Мамачка, ты сёння парсючка не кармі.
— Чаму?
— Я яго ў агарод выпусціў — няхай сам пасецца.

Садзім алею

Вя-сно-вую Пе-ра-мо-гі

Мы ў вясновую нядзелю
садзім новую алею.
Садзім тут, уздоўж дарогі, —
у гонар свята Перамогі.

Хто — бярозку,
хто — рабінку,
хто — таполю,
хто — вярбінку,

Таня — ліпку,
Клім — дубок,
Ясь — каштан,
а я — клянок.

А Святлана і Наташа
паліваюць дрэвы нашы.
Хай расце і зелянее
наша слаўная алея!

(Паводле Міхася Пазнякова)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Але́я — дрэвы, пасаджаныя ўздоўж дарогі.

1. Чым займаліся дзеці ў нядзелю?
2. Якой парой саджаюць дрэўцы?
3. У гонар якога свята працуюць дзеці?
4. Якія дрэўцы саджалі дзеці? Якія з іх вы добра ведаеце?
5. Хто паліваў пасаджаныя дрэўцы? Навошта?
6. Прачытайце верш ланцужком.
7. Вывучыце на памяць частку з назвамі дрэў. Выкарыстайце як лічылку ў гульні.

Гульня «Дрэва ці не?»

Чытайце класам словы: *бяроза, кроп, елка, бручка, таполя, фасоля, ліпа, сасна, падасінавік, дуб, ружа, каштан, клён, пралеска*.

Калі гэта дрэва, то ўставайце з-за парт, падымайце рукі ўгару. Калі не — сядайце назад, хавайце рукі пад парту.

Вясенняя раніца

Па-лю-буй-це-ся Ус-тань-це

Гляньце, дзеткі, у аконца,
ды пара ўжо ўставаць...
Як прыгожа там бясконца!
Сорам, дзеткі, позна спаць.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Заглянула сонца ў вочкі,
дзень прыйшоў — даволі сну!
На свет гляньце, галубочкі,
усе вітаюць там вясну.

Пчолкі выпаўзлі з калоды,
пачалі збіраць мядок,
шпак вартуе агароды
і вішнёвы наш садок.

Зелянее траўка ў полі,
у небе птушачкі пяюць...
Эх, зімы не будзе болей!
Хутка кветкі зацвітуць.

Вы зірніце ў аконца,
палюбуйцеся хаця:
колькі волі, колькі сонца,
колькі новага жыцця!

Устаньце, дзеткі, пойдзем у поле
спевы слухаць, кветкі рваць.
У хаце сумна, бы ў няволі...
Устаньце, дзеткі, годзе спаць!

(Паводле Міхася Чарота)

Го́дзе — *тут:* хопіць.
З кало́ды — з вулля.

1. Да каго звяртаецца аўтар?
2. Куды ён кліча дзяцей?
3. Як аўтар называе дзяцей? Знайдзіце ў тэксце.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4. Прачытайце выразна пяты слупок. Як вы разумееце гэтыя радкі?

5. Знайдзіце ў тэксце ўсе ласкавыя словы. Дапоўніце: *дзеткі, аконца, ...*

6. Спытайцеся ў дарослых, як даўно напісаны гэты верш.

На здароўе, сонейка

Аб-лю-ба-ваў	Пе-ра-ста-ра-ла-ся
Па-да-кон-ні-ку	Раз-гу-бі-ла-ся
За-да-валь-не-ння	Зда-га-да-ла-ся

Добра прыгрэла на дварэ сонейка. Кот Антон аблюбаваў сабе месцейка на падаконніку. Ціха грэецца. Вусамі варушыць ад задавальнення. Марыйка пагладзіла Антона. А ён падзякаваў дзяўчынцы:

— Мяў!

І зноў падставіў сонейку сваю пыску. А дзяўчынка палівае вазоны з кветкамі. На падаконнік перанеслі нават вазоны, што ўзімку на стале былі. Стаялі далей ад халодных шыбак. Няхай кветкі грэюцца на сонейку, як і кот Антон.

Антону ўсё ж надакучыла ляжаць. Пачаў прасіцца на двор. Калі ласка! Марыйка адчыніла яму дзверы. А сама працягвала паліваць кветкі. І тут толькі заўважыла, што перастаралася. Пацякла з аднаго вазона вада, ажно лужынка ўтварылася. І якраз на тым падаконніку, дзе нядаўна ляжаў кот. Дзяўчынка

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

хацела ўзяць анучу і выцерці ваду. А потым загулялася і забылася. Калі ўспомніла, вады ўжо не было. Хто б яе мог выпіць? Кот Антон? Дык ён жа яшчэ на двары ходзіць.

Спярша Марыйка разгубілася. Бо не ведала, на каго і падумаць. А пасля яна пра ўсё здагадалася. Паглядзела на сонейка. Усміхнулася яму і паківала пальчыкам:

— Я ведаю, гэта ты выпіла вадзічку. На здароўе, сонейка!

(Паводле Васіля Ткачова)

Аблюбава́ць — *тут:* выбраць любімае месца.
Шы́бкі — аконныя рамы.
Пы́ска — мордачка.

1. Дзе любіў грэцца кот? Як звалі ката?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

2. Пра што клапацілася Марыйка?
3. Хто замінаў ёй паліваць кветкі?
4. Што здарылася ў Марыйкі?
5. Што заўважыла Марыйка праз некаторы час?
6. Якія добрыя словы Марыйка сказала сонейку?
7. Чаму знікла вада з падаконніка?
8. Перакажыце тэкст па пытаннях 1—6.

У спёку ўсім жывым істотам патрэбна вада. Бярыце ўлетку на прагулку чыстую ваду ў бутэльцы. Яе трэба піць, калі пячэ сонца. Палівайце кветкі, калі на вуліцы горача. Давайце ваду свойскім жывёлам. Яны таксама могуць перагрэцца ў летнюю спёку.

Майская казка



Квітнее майскі сад, як казка,
звініць, пяе пчала ў галлі.
А каляровы плод —
падказка,
якія дрэвы зацвілі.

(Паводле Міколы Маляўкі)

Галлё — вецце, галіны.

1. З чым параўноўваецца майскі сад?
2. Назавіце дрэвы, якія зацвілі. Знайдзіце падказкі на малюнку.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гульня «У садзе ці ў гародзе?»

Прачытайце словы. Пасля кожнага называйце, садавіна гэта ці гародніна.

Н а п р ы к л а д: *Слівы — садавіна, морква — гародніна*; грушы — ..., буракі — ..., яблыкі — ..., агуркі — ..., салата — ..., вішні — ..., чарэшні — ..., кабачкі — ... .

Май

Каля школы —
гам вясёлы,
май
усіх збірае ў кола:
ён пазваў
на перапынак
з класаў
хлопчыкаў, дзяўчынак,
промнямі
іх атуліў,
смехам звонкім
надзяліў
і вітае
несупынна
светлым
пошчакам птушыным...
Радуецца Мая
маю,
што сяброў
багата мае.

(Паводле Кастуся Жука)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гам — *тут:* вясёлыя галасы дзяцей.
У ко́ла — *тут:* у гурт.
По́шчак — шчэбет, птушыныя песні.

1. Якому месяцу вясны прысвечаны гэты верш?
2. Чаму радуюцца дзеці?
3. Куды яны выйшлі на перапынку?
4. У якія гульні гуляюць дзеці? Складзіце з літар слова: *К, а, г, о, р, д, а.*
5. У што вы любіце гуляць? Прадоўжыце: *класікі, скакалку, ...*
6. Чаму радуецца Мая? Як вы лічыце, у гонар чаго назвалі дзяўчынку?
7. Прачытайце выразна. Выдзяляйце голасам падкрэсленыя словы.

Прыказка

Адзін за аднаго трымацца — нічога не баяцца.

Русачок і Белячок

Не-пры-кмет-ны Уз-ра-да-ваў-ся

Мінула белая зіма. Настала шэрая вясна. Русачок зноў стаў непрыкметны. Здавалася б, радуйся! Дзе хочаш, там і гуляй! А зайка сеў пад хвойкай і горка плача. На задніх лапках сядзіць. Пярэднімі — слёзы выцірае.

Прабягаў каля хвойкі Белячок. Быў ён не белы, а шэра-белы. Бо шэрая летняя поўсць яшчэ не нарасла. А белая зімовая — уся не выпала.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Убачыў Белячок Русачка і пытаецца:

— А цяпер чаго ты плачаш? Ты ж шэры, у лесе шэра. Цябе цяжка заўважыць. Гэта мне хоць памірай. Бо няма куды дзявацца. Шэра-белае футра здалёку відаць.

— Як жа мне не плакаць? — жаліцца Русачок. — У ляску, дзе я жыў, пасяліўся Ліс. Не ведаю, што і рабіць. Куды падацца.

— Бяды такой, — сказаў Белячок. — Перабірайся ў іншы лясок. Туды, дзе няма лісоў.

Узрадаваўся Русачок. Перастаў плакаць. Перабраўся ў новы лясок. І зажыў шчасліва, весела. Зразумеў, што слязамі ніякаму гору, ніякай бядзе не паможаш. Самому трэба дбаць, каб усё добра было.

(Паводле Змітра Бяспалага)

Фу́тра — *тут:* поўсць.
Трэ́ба дбаць — *тут:* трэба клапаціцца.

1. Назавіце герояў казкі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

2. Якім стаў Русачок вясною?
3. А Белячок? Якое ў яго футра? Прачытайце.
4. На што жаліўся Русачок? Чаго плакаў?
5. Што яму параіў Белячок? Ці шчыры ён сябар?
6. Што зрабіў Русачок?
7. Знайдзіце прыказку ў канцы твора. Як вы яе разумееце?
8. Раскажыце, што вы ўмееце рабіць самі, без дапамогі дарослых.

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ

1. Пра якія змены ў прыродзе вы прачыталі?
2. Які месяц вясну пачынае, а які заканчвае?
3. Назавіце ўсе веснавыя месяцы. У якога з іх самая кароткая назва?
4. Пра якую першую веснавую кветку вы прачыталі?
5. Назавіце творы, прысвечаныя пралесцы. Калі цяжка ўспомніць, паглядзіце ў канцы падручніка па змесце.
6. Якое свята адзначаюць у сакавіку? Чыё гэта свята?
7. У якім творы вы чыталі пра маміна свята?
8. Што рабіў Рыгорка, каб хутчэй настала вясна? Назавіце твор і аўтара.
9. У якім творы казёл саджаў капусту? Гэта казка ці праўда?
10. Пра якое свята гаворыцца ў творы «Садзім алею»?
11. Якія казкі вы прачыталі ў гэтым раздзеле? Перакажыце тую, што вам спадабалася.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ДОБРА ЎСІМ ЖЫВЕЦЦА ЎЛЕТКУ

Лета

Вось і лета!
Вось і лета!
Еду, еду
я да дзеда.

У дзядулі добра жыць.
Тут няма калі тужыць.
Дзед павесіў мне арэлі,
каб вятры ў вушах гудзелі.

— Уй-да, уй-да,
уй-да-да!
Неба — сіняя вада,
бор, зялёная трава.
Не кружыся, галава!

(Паводле Дануты Бічэль)

Арэ́лі — прыстасаванне, каб гушкацца.

1. Якая пара года надыходзіць пасля вясны?
2. Чаму так радуецца дзіця? Куды едзе на лета?
3. Што зрабіў дзед для дзіцяці?
4. Ці любіць яно гушкацца на арэлях?
5. Якую песеньку прыдумала? Прачытайце.
6. Прачытайце выразна. Перадайце настрой верша.
7. Ці высока гушкаецца дзіця на арэлях? Калі кружыцца галава?
8. Які час пачынаецца летам у школьнікаў? З якога месяца пачынаюцца летнія канікулы? У якім заканчваюцца? Колькі яны доўжацца?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гушкацца на арэлях весела. Але трэба добра трымацца, каб не ўпасці з вышыні. Таксама не варта высока разгойдвацца. Калі вы знаходзіцеся побач з арэлямі, не падыходзьце блізка. Не спрабуйце спыняць арэлі на хаду. Гэта небяспечна! Можна атрымаць сур'ёзную траўму.

Фізхвілінка для вачэй «Арэлі»

Завучыце фізхвілінку. Прагаворвайце. Глядзіце ў адзін і другі бок, быццам вы сочыце за арэлямі. Трымайце галаву роўна, вадзіце толькі вачамі:

Мы прыбеглі на арэлі,
смелыя — адразу селі.
А хто гушкацца баіцца,
няхай з намі не садзіцца.

(Уладзімір Мацвеенка)

Лета

1

Тра-пе-чац-ца — Гняз-дзе-чак
Па-рас-кі-да-лі — Ма-ты-лёч-каў

Прыйшло і лета. Куды ні глянь — усюды зелена. Усё расце, усё наліваецца.

На дрэвах вырасла лісце. Яно весела трапечацца на сонцы. Весела пазірае стары лес. За сялом ён цягнецца па краях поля.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Край лесу нагадвае разак, пастаўлены зубамі ўгору. Кусты арэшніку, рабіны, чаромхі густа разрасліся ўнізе. І далёка параскідалі свае зялёныя галіны. Так зелена, так густа, што, здаецца, не пралезеш у лес!

Птушкі аж глушаць сваімі галасамі, сваім шчэбетам. Некаторыя ўжо вывелі дзетак. Яны клапатліва шчабечуць каля сваіх гняздзечак, як нянькі каля калыскі.

Колькі кветак, колькі ўсялякіх матылёчкаў, мошак і пчолак! У паветры стаіць бясконцы шум і звон ад іх крылляў.

Разáк — піла.
Параскідáць — *тут:* працягнуць.
Глушы́ць — заглушаць іншыя гукі.

1. Якога колеру лес і поле летам?
2. Што нагадвае летні лес? Чым?
3. Назавіце летнія клопаты птушак. З кім яны параўноўваюцца?
4. Чаму стаіць бясконцы летні шум?

2

Поле пакрылася зеленню. Ужо падняліся авёс і ячмень. Цягнуцца палоскі гароху з чырвонымі і бледнымі кветачкамі. Віднеюцца зялёныя стужкі лёну з сіненькімі галоўкамі. Бялее грэчка. Наліваецца жыта і ціха шалясціць у полі сваімі сярэбранымі каласкамі. Як слаўна глядзець на гэтыя вузкія стужкі-палоскі сялянскага збожжа! На тое,

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

як свежы ветрык іх калыша. Як вядзе з імі невядомыя, спакойныя размовы. Як жаваранкі пяюць над імі песні, кружачыся ў небе.

Сту́жкі — *тут:* палосы, доўгія вузкія грады.

1. Што расце на вясковых палях?
2. Якія расліны з твора вам знаёмыя? Апішыце іх словамі з тэксту.
3. Якія птушачкі пяюць высока ў небе?

3

Зялёнаю шырокаю паласою раскінуўся луг паабапал рэчкі. Зарослыя лазою, маладым дубняком месцы завуць астраўцамі.

Густая высокая трава, як мора, калышацца на ветры. А кветак, кветак! Якога толькі колеру тут не

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

знойдзеш! Мільёны пчолак, чмялёў уюцца над імі са звонам і шумам. Так і цягне на прывольны луг. Там многа кветак, птушак, усякіх конікаў і матылёчкаў. Многа песень, шуму і звону. Прахалодна патыхае чысты, свежы ветрык.

Шчыраю рукою ўпрыгожыла лета ўвесь свет.

(Паводле Якуба Коласа)

Паабáпал — уздоўж, па берагах.
Мільёны — шмат.

1. Як выглядае луг? З чым параўноўваецца трава?
2. Над чым уюцца пчолкі і чмялі?
3. Куды цягне пайсці летам? Што там прывабнага?
4. Якія вы ведаеце лугавыя расліны? Знайдзіце лішняе: *канюшына, дзьмухавец, рамонак, дуб, званочак, трыпутнік (рус. подорожник).*
5. Раскажыце, дзе і як вы праводзіце сваё лета.

Загадка

Што пахне на лузе так соладка ўлетку?
Трайныя лісточкі ды шарыкі-кветкі.
Карове, каню ды сямейцы трусінай
наш Яська пайшоў накасіць *к..н..шыны*.

(Паводле Алены Церашковай)

Чэрвень

Чыр-ва-нець	Пту-ша-ня-ты
Боль-ша-сці	Кла-пат-лі-выя

Першы месяц лета — чэрвень. У чэрвені каласуе жыта, пачынаюць чырванець суніцы.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У гэты час змаўкаюць птушыныя спевы. У большасці лясных птушак вывеліся птушаняты. Клапатлівыя бацькі носяць у гнёзды корм. Чарвякоў, вусеняў, слімакоў, мушак. Нялёгка ім накарміць сваіх дзяцей! Сядзяць малыя ў гняздзе і просяць есці.

(Паводле Віталя Вольскага)

Каласу́е — выпускае каласкі.

1. Які першы месяц лета? Чаму яго так назвалі?
2. Падбярыце адпаведны малюнак.
3. Чаму ў чэрвені змаўкаюць птушкі? Чым яны занятыя?
4. Ці лёгка птушкам пракарміць сваіх дзяцей?
5. Як трэба сябе паводзіць на прыродзе? Чаму трэба захоўваць цішыню?
6. Успомніце твор «Дзядулева тайна». Чаму дзядуля вучыў свайго ўнука?

Народная прымета

Сена моцна пахне — ноччу дождж ахне.

Прымаўка

Будзе свой час ягадзе — будзе і баравіку.

Ліпень

Спя-кот-ныя Па-спя-ва-юць

Другі месяц лета — ліпень. Гэта самы гарачы месяц. Ліпень — сярэдзіна лета. Дні стаяць спякотныя. Высока ззяе ў ясным небе яркае сонца.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У ліпені паспяваюць ягады — суніцы, чарніцы, маліны, парэчкі. Цвітуць ліпа і грэчка.

(Паводле Віталя Вольскага)

1. Назавіце другі месяц лета. Падбярыце адпаведны малюнак.

2. Ці ведаеце, чаму яго так назвалі? Спытайцеся ў дарослых.

3. Што адбываецца ў прыродзе ў ліпені? Прачытайце.

4. Якія з названых ягад вам знаёмы? У якой ягады самы маленькі кусцік? Самы высокі?

5. Якія з названых ягад вы елі? Апішыце іх колер, памер, форму і смак.

Жарт

Дзяўчынка збірае воўчыя ягады. Прахожы кажа:

— Гэта воўчыя ягады! Не збірай іх!

— А нічога, дзядзечка, для ваўка яшчэ нарастуць!

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Збірайце толькі вядомыя вам ягады! Яны павінны быць спелыя. Пытайцеся ў дарослых, ці можна іх есці. Свежыя ягады доўга не захоўваюць. Яны хутка псуюцца.

Жнівень

Кам-бай-ны
Ме-ха-ні-за-та-ры

Па-спя-ва-юць

Апошні месяц лета — жнівень. У жніўні пачынаецца жніво.

На палях гудуць камбайны. Гэта механізатары збіраюць з палёў багаты ўраджай. У садах паспяваюць яблыкі, грушы, слівы. Сонечныя прамяні ўжо не такія гарачыя. Яны цяпер толькі грэюць. Але не пякуць, як у ліпені.

(Паводле Віталя Вольскага)

Механіза́тары — вадзіцелі камбайнаў.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Назавіце трэці месяц лета. Падбярыце адпаведны малюнак.
2. Як вы лічыце, ад якога слова ён атрымаў сваю назву?
3. Што адбываецца ў палях? Раскажыце сваімі словамі.
4. Назавіце, якая садавіна паспявае ў жніўні.
5. У якім месяцы заканчваюцца летнія канікулы?
6. Як вы ўлетку рыхтаваліся да школы? Хто вам дапамагаў?

Прыказка

Хто летам халадку шукае,
той узімку галадае.

Купалле

Сёння Купала, а заўтра Ян.
Зайграй, сонейка, зайграй!
Мы ж цябе, Купалле,
шанаваць будзем!
Мы ж цябе, Купалле,
святкаваць будзем!

(З народнай песні)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Купа́лле, Ян, Іва́н Купа́ла — народнае свята.
Зайгра́й — *тут:* пасвяці.

1. Калі святкуюць Купалле — улетку ці ўзімку?
2. Як святкуюць Купалле? Разгледзьце фотаздымкі.
3. Спытайцеся ў дарослых, якую кветку раней шукалі ў гэтае свята.
4. Ці можна праспяваць гэты верш? У якім месяцы спяваюць купальскія песні?
5. Праспявайце верш хорам.

На Купалле ёсць адзін звычай. Людзі шукаюць папараць-кветку. Ёсць такое павер'е. Каму гэтая кветка пакажацца, той будзе разумець мову птушак і звяроў. Стане багаты і шчаслівы.

Каласавічок

1

Пры-рэч-ным	Ад-га-ва-рыць
Вы-ка-ла-сі-ла-ся	Чар-ніч-ні-ку

Прыехалі дзед з Алесікам на выхадны дзень у вёску. Ад хлапчукоў Алесік даведаўся — у прырэчным ляску з'явіліся першыя летнія грыбы.

— Дзед, пойдзем у лес па грыбы! — прыстаў Алесік.

— Якія цяпер грыбы, — пярэчыў дзед. — Яшчэ і жыта не выкаласілася як мае быць... Грыбы з'явяцца пазней, пад восень.

Ды Алесіка не так проста адгаварыць. Хочаш не хочаш, а давялося збірацца. Хутка дзед з Алесікам

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

апынуліся ў ляску. Доўга блукалі яны з кошыкамі па верасе і чарнічніку. Нічога не знайшлі.

Не вы́каласілася — *тут:* не даспела.
Прырэ́чны — каля ракі.
Як ма́е быць — *тут:* цалкам, канчаткова.

1. Куды прыехалі дзед з Алесікам на выхадныя?
2. Аб чым даведаўся Алесік ад хлопчыкаў?
3. Куды ён паклікаў дзядулю?
4. Ці адразу дзед згадзіўся ісці ў лес? Прачытайце.
5. Чым закончылася іх вылазка ў лес?

2

Пад-сіл-ку-ем-ся Гас-па-да-ры-лі

— Што, стаміўся, унучак? — спытаў дзед. — То давай прысядзем вунь каля таго дубка, на курганку, ды падсілкуемся.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Давай, — адразу згадзіўся Алесік. І кінуўся да курганка.

Аказалася, што гэта не курганок, а мурашнік.

Алесік яшчэ не бачыў такога дзіва. Рыжыя мурашы гаспадарылі каля свайго жытла. Яны не звярталі ніякай увагі на дзеда і Алесіка. Алесік глянуў далей, за мурашнік, і радасна закрычаў:

— Грыб! Я грыб знайшоў!

Грыб быў малады, тоўсценькі, крамяны.

Дзед з Алесікам пачалі тупаць паблізу мурашніка. І Алесік знайшоў яшчэ тры каласавічкі.

(Паводле Сцяпана Кухарава)

Крамя́ны — *тут:* моцны, тугі.
Мура́шнік — жытло мурашоў.
Падсілкава́цца — пад'есці.
Каласавічкі́ — баравікі са светлымі шляпкамі, летнія баравікі.

1. Ці доўга шукалі дзед з унукам грыбы?
2. Дзе яны селі падсілкавацца?
3. Чым займаліся мурашы?
4. Дзе знайшліся грыбы? Разгледзьце малюнак.
5. Чаму летнія грыбы называюць *каласавічкі*? Здагадаліся самі? Калі не — спытайцеся ў дарослых.
6. Ці збіралі вы грыбы? З кім хадзілі? Калі гэта было? Раскажыце. Зрабіце замалёўкі на тэму «Грыбы».

Улетку з'яўляюцца лісічкі, каласавікі, маслякі, сыраежкі. А ўвосень — апенькі, падасінавікі, баравікі, абабкі, грузды, рыжыкі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Загадкі

У крамянай цёмнай шапцы,
у лясочку, на палянцы
з-пад зямлі за ноч узнік
тоўсты дзядзька *б..р..вік*.

Побач — жоўтыя сястрычкі,
тры вясёлыя *л..сі..кі*.

Крыху ўбок, ля самай сцежкі, —
маладыя *с..р..ежкі*.

А за імі ў тры рады
селі чорныя *гр..зды*.

(Алена Церашкова)

Рэха

Ад-ка-за-ла Вод-гул-ле

Жэня ў бор густы прыйшоў
пашукаць арэхаў,
ён паклікаў малышоў, —
адказала рэха.
Заспяваў ён — і ляціць
водгулле са смехам,
бор спявае, бор шуміць,
бор гукае рэхам.
Жэня змоўк — і бор заціх,
звіслі елак стрэхі,
і пытае Жэня ў іх:
— Дзе схавалі рэха?

(Паводле Канстанцыі Буйло)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Во́дгулле — *тут:* рэха.

1. Што шукаў хлопчык у бары?
2. Каго клікаў Жэня? Што пачулася ў адказ?
3. На што яшчэ адгукалася рэха?
4. Пра што пытаўся Жэня ў елак? Ці сапраўды яны схавалі рэха?
5. Ці бывае рэха ў школьным калідоры? У вялікім пустым памяшканні?
6. Пагуляйце ў рэха. Паўтарайце апошнюю частку слоў: *во-сем, пя-сок, Ба-рыс, ку-лак, пі-рог, шта-ніна, кара-год.* Якія словы атрымаліся?
7. Ці былі вы ў лесе? Гукалі рэха? Пакажыце, як.

Народная прымета

Як гукнецца, так і адзавецца.

Калі летам вечарам у полі чуецца рэха, на наступны дзень чакай добрае надвор'е.

Загадкі на градках

Лас-ка-вей-шы Зай-здрос-ныя

От бабуля важна села
і глядзіць навокал смела.
У зямлю схавала лапаць.
Як зачэпіш —
будзеш плакаць.
Гэта злосная бабуля
называецца ... .

Ц		Б			Я

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У бабулі родны брат
ласкавейшы быццам,
а да слёз давесці рад,
так, як і сястрыца.
Ты не вельмі плач, сынок,
калі шчыплецца … .

Ч		С			К

Гэта што за важны туз,
хвост зялёны,
чэпкі вус?
Усім вядомы карапуз
Пузан Пузанавіч … .

Г		Р			З

З вусамі, а не стары.
Зайздросныя вочы.
За што-небудзь на двары
ўчапіцца хоча.
Хопіць хітрасці на трох.
Ну, на тое ж ён … .

Г		Р		Х

(Паводле Рыгора Барадуліна)

1. Прачытайце загадкі.
2. Знайдзіце адгадкі на малюнках. Падстаўце адгадкі ў тэкст замест пропускаў.
3. Якая расліна паказана хітрай? Якая — злоснай? Якая важнічае?
4. Ці бываюць людзі з такімі рысамі характару?
5. Вывучыце адну загадку на памяць.

На гародзе рос гарох…

На гародзе рос гарох,
а за рэчкай — грэчка.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ох, ох, ох ды ох, ох, ох,
наш стары казёл Цімох
на гародзе рваў гарох.

(Паводле Эдзі Агняцвет)

1. Прачытайце першыя два радкі. Які гук сустракаецца ў словах часцей за ўсё?

2. Навучыцеся вымаўляць скорагаворку спачатку павольна, а потым хутка.

3. Калі кажуць *«ох, ох, ох»*? Калі радуюцца, калі бядуюць ці калі незадаволеныя?

4. Уявіце, што вы ўбачылі казла ў агародзе. Прачытайце трэці радок і далей. Пакажыце, быццам вы бядуеце.

Загадка

За плот чапляецца вусамі
сцябло з тугімі гаманцамі.
У гаманцах сядзяць сынкі,
гадуюць круглыя бакі.
Калі вусач пажоўк, засох,
глядзі: пара збіраць *г..р..х*!

(Алена Церашкова)

Гаманéц — кашалёк.

Па былінках...

Бы-лін-ках — Га-лін-ках

Па былінках,
па галінках
скача дожджык
уначы.

Ён напіцца,
ён наліцца
хоча жыту
памагчы.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Шапачы, лапачы,
цёплы дожджык
уначы!

(Паводле Авяр'яна Дзеружынскага)

1. Калі прайшоў дожджык?
2. Якое вырасце жыта? Як яму дапамагаў дожджык?
3. Які атрымаецца ўраджай, калі доўга летам не будзе дажджу?
4. Уявіце, што вы — дожджык і скачаце па галінках. Паскачыце на месцы падчас фізхвілінкі.
5. Як трэба чытаць гэты верш? Хутка ці павольна?

Заклічка

Сыпні, дожджык, трошку —
дам табе гарошку.
Прайдзі, дожджык, па сялу —
дам табе я кісялю.

(Авяр'ян Дзеружынскі)

Перад дажджом

Птушкі — ластаўка і пліска —
над зямлёй лятаюць нізка.
Сціхла ўсё перад дажджом —
значыць, вухне з хмары гром.

(Паводле Уладзіміра Паўлава)

Вýхне — *тут:* моцна загрыміць, бахне.

1. Прачытайце выразна. Знайдзіце ў вершы прыметы.
2. Якія прыметы вы яшчэ ведаеце? Раскажыце.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ластаўка і пліска палююць на мух і камароў. Перад дажджом мошкі апускаюцца ніжэй. Птушкі ловяць іх на ляту, амаль каля самай зямлі. Таму кажуць: ластаўка і пліска нізка лятаюць перад дажджом.

Летняя раніца

Ру-мя-ніц-ца
Уві-ха-ец-ца
Рас-па-чы-на-ец-ца
За-ту-ма-ніц-ца

Летняя раніца
сонцам румяніцца,
летняя раніца
пахне расой.
Летняя раніца
спрытна ўвіхаецца
на сенакосе з касой.
Летняя раніца
распачынаецца
шумам і гулам
машын.

Летняя раніца
з вудаю бавіцца
на берагах азярын.
Летняя раніца
як затуманіцца —
спаць не дае грыбнікам.
Летняя раніца
ветла ўсміхаецца
людзям,
іх рупным рукам.

(Паводле Авяр'яна Дзеружынскага)

Румя́ніцца — *тут:* зіхацець яркім колерам.
Увіха́цца — спраўляцца.
Ба́віцца — *тут:* праводзіць час.
Азяры́н — азёр.
Ве́тла — ветліва, прыветна.
Ру́пны — працавіты.

1. Пра якую раніцу гаворыцца ў вершы? Прачытайце.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

2. Чым пахне летняя раніца?

3. Што робяць людзі летняй раніцай? Да поўніце: *на сенакосе ..., на возеры ..., на дарозе ..., у лесе ...* .

4. Каму не дае спаць летняя раніца?

5. Чытайце выразна кожны слупок паасобку. З чаго пачынаецца раніца ў кожным слупку?

6. Як рана пачынаецца працоўны дзень вашых бацькоў? Спытайцеся ў іх.

Прыказка

Хто летам позна спіць, той лета не бачыць.

Лівень

За-ляс-ка-лі	Пры-таі-ла-ся
Па-за-ла-зі-лі	Пра-ся-дзе-лі
Шчы-лін-кі	Скон-чыў-ся

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У лесе нечакана сыпануў дождж. Буйны́я цёплыя кроплі гучна заляскалі па траве і лісці дрэў. І ўсе пачалі хавацца ад дажджу.

Жучкі, матылькі, мухі пазалазілі хто куды. Хто ў чашачкі кветак. Хто пад лісце. Хто ў розныя шчылінкі.

Мышка прытаілася пад чырвоным мухаморам.

Сінічкі ў дуплы пахаваліся.

А жабы, што сядзелі на беразе сажалкі, разгубіліся. Думалі-думалі, куды б ім схавацца, і скокнулі ў ваду. Так і прасядзелі там, пакуль не скончыўся лівень.

(Паводле Васіля Хомчанкі)

Лі́вень — моцны дождж.

1. Што здарылася ў лесе? Ці моцны пайшоў дождж? Прачытайце.
2. Як хаваліся лясныя жыхары ад дажджу? Разгледзьце малюнак. Д а п о ў н і ц е: *жучкі (што зрабілі?) ..., матылькі ..., мухі ..., мышка ..., сінічкі ...* .
3. Што прыдумалі жабы? Ці ўдалося ім схавацца ад дажджу?
4. Ці траплялі вы пад дождж? Пад чым хаваюцца людзі ад дажджу? Раскажыце.
5. Што трэба зрабіць, калі вы прамоклі пад дажджом?
6. Пастукайце падушачкамі пальцаў па парце. Паслухайце гук. Ён падобны на дождж? Зрабіце так, каб дождж стаў мацнейшы, цішэйшы.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Мне мілей за ўсё...

Пры-вол-ле На-гля-дзец-ца

Мне мілей за ўсё прыволле:
лес, лужок, рачулка, поле...
Наглядзецца на ўсё гэта,
як відаць, не хопіць лета.

(Паводле Пятра Сушко)

Прывóлле — *тут:* прастора, прырода навокал.

1. Што вельмі міла герою твора? Прачытайце.
2. Што азначае *«не магу наглядзецца»*? Спытайце ў дарослых. Растлумачце апошнія радкі.
3. Дзе вы адпачывалі летам: каля рэчкі, лугу, лесу, поля? Раскажыце пра свае ўражанні.

Па ягады

Па-ві-тац-ца Ся-стры-цай

Суніцы

З кожнай, кожнай
ягадай
павітацца рады я...
З мамай я
збіраў суніцы.
А з бабуляю — чарніцы.
Ездзіў з татам
у маліны.

Маліны

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ажыны

А з дзядулем —
у ажыны.
А сёння мы
з сястрыцай
пойдзем разам
у брусніцы.

Бруснiцы

(Паводле Міхася Пазнякова)

1. З чым рады павітацца хлопчык? Прачытайце першыя тры радкі.
2. З кім ён збіраў ягады? Знайдзіце ў вершы.
3. Якія ягады збіраў хлопчык? Разгледзьце малюнак.
4. Якія ягады вам добра знаёмы? Якімі ягадамі вы частаваліся? Якія больш спадабаліся?
5. Словы *суніцы — брусніцы, маліны — ажыны* падобныя па гучанні. У які ланцужок трэба дадаць *чарніцы*?
6. Уявіце, што вы збіраеце ягады. Пакажыце, як трэба іх збіраць.

Скорагаворка

Як чарніцы не брусніцы, так брусніцы не чарніцы.

Па арэхі

Апя-рэ-дзі-ла Па-пя-рэ-дзі-ла

Ясь і Стась
з вясёлым смехам
беглі з мехам
па арэхі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Апярэдзіла іх рэха,
папярэдзіла арэхі.
Пад лісточкі,
як пад стрэшкі,
пахаваліся
арэшкі.

(Паводле Пятра Сушко)

Стрэ́шка — дах.

1. Куды беглі Ясь і Стась? Па што?
2. Які ў іх быў настрой? Прачытайце.
3. Што адгукнулася на іх вясёлы смех? Складзіце слова: *Р, а, х, э.*
4. Куды пахаваліся арэшкі? Чаму?
5. Які гук паўтараецца ў словах *смехам — мехам — рэхам — арэхі — рэха*? Ці можна назваць верш чыстагаворкай?
6. Навучыцеся спачатку чытаць верш павольна. Затым чытайце хутчэй. Вымаўляйце ўсе гукі правільна.
7. Развучыце верш. Выконвайце як фізхвілінку.

Ціхая мясціна

Вы-ха-валь-ні-ца	Кан-стан-ці-наў-на
Лю-ба-ва-лі-ся	Пе-ра-шэпт-ва-юц-ца
Пры-га-жо-сцю	Стра-ка-та-лі

Дзеці пайшлі ў лес. Здаецца, блізка лес. А пакуль дайшлі — стаміліся.

— Зараз адпачнём, — сказала выхавальніца. — Вось толькі ціхую мясцінку знойдзем.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

На зялёнай палянцы прыселі адпачыць. Сядзелі моўчкі. Любаваліся прыгажосцю лесу. І раптам Ігарок загаварыў:

— Надзея Канстанцінаўна, а мясцінка наша не ціхая.

— Чаму ты так рашыў, Ігарок? — паглядзела на яго выхавальніца.

— Я чую, як птушкі спяваюць. Як лісточкі перашэптваюцца...

Прыслухаліся.

Спявалі птушкі.

Перашэптваліся лісточкі.

Звінеў камарык.

Шапацеў у траве жучок.

Стракаталі конікі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Па дарозе дамоў выхавальніца сказала:

— Бачыце, дзеці? Цяжка ў лесе знайсці ціхую мясціну. Як і на ўсёй нашай Зямлі. Вялікай і прыгожай.

(Паводле Васіля Ткачова)

1. Куды пайшлі дзеці?
2. Дзе яны прыселі адпачыць?
3. Што заўважыў Ігарок?
4. Што пачулі дзеці, калі прыслухаліся? Прачытайце.
5. Што сказала дзецям выхавальніца?
6. Перакажыце тэкст па пытаннях 1—5.
7. Як вы лічыце, ці можна знайсці ў лесе ціхую мясціну?
8. Ці даводзілася вам бываць у лесе? З кім хадзілі? Што вы чулі?

Падчас летніх канікул хадзіце з дарослымі на прыроду. Слухайце моўчкі яе галасы. Ціха назірайце за прыродай. Не турбуйце мурашоў, дзікіх пчол, птушак.

Сонца

Сонейка свеціць ад ранку да вечара.
Сонейка грэе ад ранку да вечара.
Хоча яно, каб шумелі сады,
каб у садах спелі дзецям плады,
каб колас у полі хіліўся к раллі,
каб травы раслі,
каб кветкі цвілі,
каб людзі шчасліва жылі на Зямлі.

(Паводле Івана Муравейкі)

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Хіліўся к раллі́ — *тут:* хіліўся да самай зямлі.

1. Што робіць сонейка?
2. Ці будзе ўсё расці і цвісці без сонца? Што дае нам сонца? Успомніце з урокаў па прадмеце «Чалавек і свет».
3. Чаго хоча сонейка? Чытайце, загінайце пальчык на кожнае жаданне. Колькі налічылі жаданняў?
4. Якія жаданні вам падабаюцца?
5. Чытайце выразна, выдзяляйце пералічэнні.

Летам

Будзем плаваць і купацца,
звонкай песняй разліваццa
ды пад сонцам і паветрам
уперагонкі бегаць з ветрам.

Загартуем дух і цела,
каб увосень закіпела
з новай сілай і ахвотай
наша школьная работа.

(Паводле Петруся Броўкі)

Загарту́ем дух і це́ла — *тут:* набяромся сіл.

1. Што дзеці будуць рабіць летам? Прачытайце.
2. Навошта адпачываць перад школай?
3. Прачытайце выразна. З якім настроем трэба чытаць верш?
4. Як вы праводзіце летнія канікулы?
5. Як загартоўваеце сябе?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Хораша летам у лесе і на рацэ. Але хадзіць у лес або купацца трэба разам з дарослымі. Пытайцеся ў дарослых дазволу!

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ ПАЎТАРЭННЯ

1. Назавіце летнія месяцы.
2. Які месяц лета пачынае? А які яго заканчвае?
3. Якія творы прысвечаны гэтым месяцам? Знайдзіце ў канцы падручніка па змесце.
4. Пра што вы даведаліся з твора «Каласавічок»? Чаму грыбы атрымалі такую назву?
5. Перачытайце твор «Загадкі на градках». Загадайце загадкі дома дарослым.
6. Куды хаваліся жывёлы ў творы «Лівень»? Намалюйце.
7. Успомніце, якія ягады збіраў хлопчык у вершы «Па ягады».
8. Што шукалі дзеці ў творы «Ціхая мясціна»? Ці знайшлі яе? Раскажыце сваімі словамі.
9. Які твор з гэтага раздзела вам спадабаўся?
10. Ці любіце вы чытаць? Ці будзеце чытаць летам?
11. Разам з дарослымі палічыце, колькі слоў вы чытаеце за хвіліну. Запішыце свае поспехі ў чытанні: *я чытаю ўголас ... слоў за хвіліну; я чытаю сам(а) сабе ... слоў за хвіліну*.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ЧЫТАЕМ САМІ

ДЛЯ ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ

Русачок і Белячок

Урывак пра зіму

Настала белая зіма. Снегу выпала шмат. На полі, у лузе, у лесе — скрозь бела. А на белым снезе Русачок вельмі прыкметны. Сеў ён пад елачкай і горка плача. На задніх лапках сядзіць, пярэднімі слёзы выцірае.

Прабягаў каля елачкі зайка Белячок. Ён ужо ўвесь выліняў, быў белы-белы, як снег. Толькі кончыкі вушэй чорныя.

Убачыў Белячок Русачка і пытаецца:

— А чаго ты плачаш?

— Як жа мне не плакаць! — жаліцца Русачок. — Добра табе, ты ўвесь белы. На белым снезе цябе ніхто не заўважыць. А мне хоць з голаду памірай, баюся вылезці з-пад елачкі, бо адразу хто-небудзь схопіць.

— Бяды такой, — сказаў Белячок. — Удзень спі, адпачывай. А як толькі сцямнее — бегай, дзе табе захочацца.

Узрадаваўся Русачок, перастаў плакаць. І так пасмялеў, што кожную ноч бегаў у вёску. Абгрызаў кару на маладых яблынях і грушах.

(Паводле Змітра Бяспалага)

1. Назавіце герояў казкі.

2. Раскажыце, аб чым прачыталі.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Прачытайце казку некалькі разоў — кожнаму члену сям'і.

4. Як людзі ахоўваюць дрэўцы ад зайцоў?

Коцік, пеўнік і лісіца

Беларуская народная казка

Жылі-былі коцік і пеўнік. Добра жылі, дружна. Коцік на паляванне хадзіў. А пеўнік есці варыў, хатку падмятаў, песні спяваў. Аднойчы пайшоў коцік на паляванне. А пеўнік зачыніў за ім дзверы ды пачаў абед варыць.

Бяжыць лісіца, убачыла хатку, падскочыла да акенца:

— Гэй, хто тут гаспадар?

— Я, — кажа пеўнік.

— Пусці ў хатку.

— Чаго?

— Пасяджу трохі, адпачну з дарогі.

Пеўнік добры быў, пусціў лісіцу ў хатку, а лісіца — цап! — ухапіла яго і панесла дадому. Апамятаўся пеўнік, закрычаў на ўвесь лес:

— Коце, браце!
Мяне ліска нясе
ў высокія горы,
у глыбокія норы,
па барах, па карчах,
аж бярэ мяне страх!..

Пачуў гэта коцік, прыбег, адабраў у лісіцы пеўніка і завёў яго назад у хатку.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ну, — кажа, — глядзі ж, другі раз не пускай, бо цяпер я далей пайду і магу не пачуць цябе.

— Добра, — кажа пеўнік, — не пушчу.

Зноў пайшоў коцік на паляванне. А лісіца — тут як тут.

— Пеўнік, галубок, разумны лабок, адчыні!

— Што табе трэба?

— Пазыч агню.

— Навошта?

— Буду ў печы паліць.

— Не адчыню, бо ты схопіш мяне.

— Ды не, больш не буду хапаць.

Паверыў пеўнік лісіцы і адчыніў дзверы. А тая ўхапіла яго і панесла. Пеўнік зноў пачаў клікаць коціка:

— Коце, браце!
Мяне ліска нясе
ў высокія горы,
у глыбокія норы,
па барах, па карчах,
аж бярэ мяне страх!..

Добра, што коцік далёка не адышоўся ад дому. Пачуў ён пеўніка, прыбег і адабраў яго ў лісіцы.

— Ну, — кажа коцік, — калі трэці раз пусціш лісіцу — бяда будзе. Цяпер я пайду на паляванне яшчэ далей.

— Не, — кажа пеўнік, — больш я гэтай ліхадзейцы дзвярэй не адчыню.

— Глядзі ж! — І коцік пайшоў у самыя далёкія лясы.

Прыбегла лісіца:

— Пеўнік, галубок, разумны лабок, дай вугалёк!

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Не, цяпер я дзверы табе не адчыню!

— Дык ты праз акенца падáй.

— Праз акенца можна, — згадзіўся пеўнік.

Адчыніў ён акенца, а лісіца ўхапіла яго і панесла.

Крычаў, крычаў пеўнік, ды коцік яго так і не пачуў. Вельмі ж далёка ён зайшоў.

Прынесла лісіца пеўніка дахаты. Загадала дочкам у печы паліць, з пеўніка крупнік варыць. А сама пайшла гасцей склікаць.

Вярнуўся з палявання коцік, бачыць — няма пеўніка. «Мусіць, яго зноў лісіца ўхапіла, — падумаў коцік. — Як жа яго цяпер з бяды выратаваць?»

Зрабіў ён скрыпачку галасістую ды пайшоў да лісіцы. Прыйшоў, сеў ля варот і зайграў, прыпяваючы:

— Тылі-тылі, скрыпіца,
тут сядзела лісіца,
а ў лісіцы новы двор,
сем дачушак на выбор,
восьмы пеўнік — гэта мой!

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Пачулі лісіцыны дочкі музыку і кажуць:

— Як жа хораша нехта грае. Пабяжым паслухаем, а пеўніка зварыць яшчэ паспеем.

Выбеглі яны на двор ды і заслухаліся.

Пеўнік жа тым часам не драмаў: выскачыў з лісіцынай хаткі ды пабег з коцікам дадому.

Так і засталася лісіца ні з чым.

1. Пра каго гэтая казка?
2. Што адбылося з героямі казкі? Раскажыце.
3. Колькі разоў хадзіў коцік на паляванне? Колькі разоў лісіца прыходзіла да пеўніка? Колькі разоў коцік выратоўваў свайго сябра?
4. У якіх яшчэ казках вы бачылі трохразовыя паўтарэнні?
5. Прачытайце казку некалькі разоў — кожнаму члену сям'і.
6. Чаму вучыць казка? Як трэба паводзіць сябе з незнаёмымі людзьмі?

Як курачка пеўніка ратавала

Беларуская народная казка

Жылі-былі курачка і пеўнік. Курачка яйкі несла, а пеўнік зярняткі здабываў, курачку частаваў. Выграбе з ямкі зярнятка і кліча курачку:

— Ко-ко-ко, Чубатка, знайшоў зярнятка!

Вось аднойчы выграб пеўнік вялікую бобінку. «Ну, — думае, — гэтага зярняці курачцы не праглынуць, з'ем хіба сам». Праглынуў — ды і падавіўся. Паваліўся пеўнік, ногі задраў і не дыхае.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Падбегла да яго курачка:

— Што з табою, Петрусёк? Чаму ты ляжыш і не дыхаеш?

— Ой, — стогне пеўнік, — бобінкай падавіўся...

— Як жа цябе ратаваць, Петрусёк? — пытаецца курачка.

— Трэба, — шэпча пеўнік, — масла дастаць, горла змазаць.

— А дзе яго дастаць?

— У каровы.

Пабегла курачка да каровы:

— Карова, карова, дай масла!

— Нашто табе масла?

— Пеўнік, бедны, ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся...

— Добра, — кажа карова, — дам табе масла. Але схадзі спярша да касцоў, папрасі сена.

Прыйшла курачка да касцоў:

— Касцы, касцы, дайце сена!

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Нашто табе сена?

— Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

Касцы кажуць:

— Схадзі да пекара, папрасі пірагоў. Пірагі мы з'ямо, тады і сена накосім.

Прыйшла курачка да пекара:

— Пекар, пекар, дай пірагоў!

— Навошта табе пірагі?

— Пірагі — касцам. Касцы накосяць сена. Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

Пекар кажа:

— Збегай у лес, прынясі дроў, каб было чым печ затапіць, каб было на чым пірагі пячы.

Пабегла курачка ў лес і прынесла дроў. Пекар напёк пірагоў. Занесла курачка пірагі касцам. Касцы з'елі пірагі і накасілі сена. Прынесла курачка сена карове. Карова з'ела сена і дала масла. Пеўнік змазаў маслам горла і праглынуў бобінку.

Праглынуў і зноў весела на ўвесь двор заспяваў:

— Ку-ка-рэ-ку! Чуб-чубатка — малайчына!

---

1. Аб чым гаворыцца ў гэтай казцы?
2. Як ратавала курачка пеўніка? Разгледзьце малюнкі.
3. Ці ўдалося курачцы выратаваць пеўніка? Хто ёй дапамог?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4. Навошта пекару для пірагоў былі дровы?

5. Чаму вучыць гэтая казка? Ці трэба клапаціцца адно аб адным?

Вожык і ручаёк

Казка

Восенню знайшоў вожык трухлявы пень. Зрабіў у ім гняздо з лісця і заснуў.

Доўга спаў вожык ці не — сам не ведае. Але аднойчы пачуў, што нехта трывожыць яго. Усё бубніць і бубніць непадалёку. Высунуў пыску з гнязда, глядзіць — ручаёк весела журчыць.

— Прачнуўся сам і іншых будзіш, — папракнуў вожык. — А я не выспаўся яшчэ, ручаёк.

І зноў у гняздо залез і заснуў. Раніцаю вочкі расплюшчыў і зморшчыўся. Увесь бачок мокры. Вылез з гнязда і бачыць: ручаёк пашырэў. Да самага пня падступіўся.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ну, пачакай! — зазлаваў вожык. — Я цябе зямлёю засыплю.

Хуценька падбег да ручайка, а той падхапіў яго і панёс.

Плыве вожык, да беражка прыстаць не можа. А наўкола — вясна. Лёгкі туманок над зямлёю сцелецца. Пралескі ўжо расцвілі. У сінім небе жаваранкі спяваюць.

Вожык і пра злосць сваю забыўся. Выбраўся з вады на беражок і сказаў:

— Дзякуй, ручаёк. Каб не ты, я вясну праспаў бы ў цёплым гняздзечку.

(Паводле Янкі Галубовіча)

1. Пра якую пару года гэтая казка?
2. Назавіце герояў твора.
3. Што здарылася з вожыкам? Ці быў ён спачатку задаволены?
4. Чаму ён пасля быў удзячны ручайку?
5. Ці ўмееце вы дзякаваць? Ці часта вы дзякуеце?

Птушыныя напевы

Цінь-цінь, цінь-цінь,
цінь-цінь, цінь-цінь —
вясну вызвоньвалі
сінічкі,
жыў-жыў, жыў-жыў,
жыў-жыў, жыў-жыў —
пеў верабейка
невялічкі.

Чуфыш-чуфыш,
чуфыш-чуфыш —
глушэц прысеў
на такавішча,
ціві-ціві,
ціві-ціві —
бадзёра шпак вясёлы
свішча.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Тра-ту, тра-ту,
тра-ту, тра-ту —
пяе пярэсты дзяцел
звонка.
Званочкам
срэбраным звініць
у небе
песня жаваронка.

Усім
так радасна вясной,
калі прырода
ажывае,
у кожнага
ёсць голас свой,
нават сама зямля
спявае.

(Паводле Авяр'яна Дзеружынскага)

1. Пра што гаворыцца ў вершы?
2. Якія вясновыя песні ў птушак? Знайдзіце ў тэксце і раскажыце.
3. Якіх птушак з верша вы ўжо ведаеце? Якіх — не?
4. Прачытайце кожны слупок паасобку. Паўтарыце песні птушак — спачатку павольна, потым хутчэй. Ці лёгка гэта зрабіць?
5. Як вы разумееце словы *«сама зямля спявае»*? Пра чые песні гэта гаворыцца?

Пчолы і кветкі

Казка

Вясновай раніцай выйшлі з вулля на ганачак пчолы. Працерлі лапкамі вочкі, агледзеліся навокал і кажуць:

— Які цудоўны дзень!

— Май да нас прыйшоў.

— Шкада, кветак яшчэ не відаць. А ў нашай кладоўцы запас мёду хутка скончыцца.

І тут адна пчолка ўсклікнула:

— Сястрыцы, паглядзіце, а там вунь — што?

— Дык гэта ж бутоны!

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Падляцелі пчолкі да бутонаў і загаварылі хорам:

— Добры дзень, бутончыкі!

— Сонца свеціць, а вы такія сумныя. Надзьмутыя.

— Хочаце, мы вам песеньку спяём?

І заспявалі:

— Добры дзень прыйшоў да вас.
Хто ж сярдуе ў гэты час?
Стане вам усім лягчэй —
усміхніцеся хутчэй!

Бутоны заківалі галоўкамі і не ўтрымаліся — усмешкамі расцвілі:

— Ну і пчолкі! Ну і пацешніцы!

— За такую песню як не пачаставаць вас нектарам?!

— Частуйцеся, калі ласка!

І пчолы, нібы цалуючы, прыпалі да вясновых кветак.

(Паводле Станіслава Валодзькі)

1. Аб чым гаворыцца ў гэтым тэксце?
2. Як пчолкі і кветкі дапамаглі адно аднаму?
3. Якія словы належаць пчолкам? Якія — кветкам?
4. Якія ветлівыя словы тут сустракаюцца? Прачытайце.

Пра што кукуе зязюля?

Беларуская народная казка

Было гэта даўным-даўно, калі зязюля сваю сям'ю мела. Жыла адна зязюля з дзецьмі: сынком і дачкою. Маці кожнай раніцай лятала далёка ў лес па чарвякоў, казюлек. А дзяцей пакідала ў хатцы адных.

— Глядзіце ж, дзеткі, нікуды не выходзьце! Чакайце мяне! — наказвала яна.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Але дзеці не вельмі слухаліся маці. Толькі яна вылятала шукаць спажыву — яны замыкалі хатку на замок. А самі ішлі гуляць.

Аднойчы так загуляліся, што не заўважылі, як згубілі ключык ад хаткі. Толькі пад вечар агледзеліся.

— Ой, што ж нам рабіць цяпер? — спалохалася сястрыца. — Хадзем, брацік, шукаць ключ! Ты ідзі ў той бок, а я — у гэты. Як знойдзеш ключ, дык гукай мяне. А я знайду — цябе гукаць буду.

Разышліся яны ў розныя бакі. Сястрыца хутка знайшла ключ і пачала клікаць брата. Але ён адышоў далёка і заблудзіўся.

Так вось і лятае аж да гэтага часу сястрыца па лясах, па садах. Усё шукае свайго брата:

— Ку-ку, брацік! Ку-ку, ключык знайшла! Дзе ты? Ку-ку!

1. Ці спадабалася вам казка? Назавіце яе герояў.
2. Што здарылася ў сям'і зязюлі? Чаму?
3. Гэта сумная ці вясёлая казка?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4. Чаму вучыць гэтая казка? Ці трэба быць паслухмянымі дзецьмі?

Дожджык і Гром

Казка

На цёплай хмарцы спаў Дожджык.

Спіць сабе Дожджык. Падкраўся да яго Гром ды як гыркне, як раўне! Спалохаўся Дожджык, прачнуўся, заплакаў. Паліліся слёзы на зямлю.

А людзі кажуць: дождж ідзе. Умываюцца поле, луг. Умываюцца пшаніца, трава. Выплакаўся Дожджык — перастаў дождж.

(Паводле Васіля Сухамлінскага)

1. Аб чым гаворыцца ў гэтай казцы?

2. Чаму спалохаўся Дожджык?

3. Ці радуюцца людзі дажджу? Чаму?

4. Ці можна палохаць адзін аднаго? Гэта добры ці дрэнны ўчынак? Чаму?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ЛІТАРАТУРА

1. *Балтрукевіч, Е. І.* Загадкі для дзетак / Е. І. Балтрукевіч [Электронны рэсурс] // ГУО «Ясли-сад № 91 г. Гродно». — Рэжым доступу: https://ddu91grodno.schools.by/ class/16320/news/290430. — Дата доступу: 12.09.2019.

2. *Велянцэвіч, А.* Загадкі / А. Велянцэвіч [Электронны рэсурс] // Буся : часопіс для маленькіх. — 2019. — 14 мая. — Рэжым доступу: http://www.veselka.by/?p=12820#more-12820. — Дата доступу: 12.09.2019.

3. Выслоўі / склад., сістэматызацыя тэкстаў, уступ, артыкул і камент. М. Я. Грынблата ; рэд. тома А. С. Фядосік. — Мінск : Навука і тэхніка, 1979. — (Вусная народная творчасць).

4. *Галіноўская, Н. В.* Палёт з Карласанам : вершы, казкі, жарты, небыліцы, смяшынкі, скорагаворкі, пацешкі, загадкі : для мал. шк. узросту / Н. В. Галіноўская. — Мінск : Маст. літ., 2006.

5. Дзед Бялын. Загадкі / Дзед Бялын [Электронны рэсурс] // Вясёлка : часопіс для дзяцей. — 19.02.2019. — Рэжым доступу: http://www.veselka.by/?p=12484#more-12484. — Дата доступу: 12.09.2019.

6. *Дубініна, Д. Н.* Паэзія для маленькіх дзетак. Знаёмства з творамі фальклору / Д. Н. Дубініна [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/19311. — Дата доступу: 10.06.2020.

7. Жарты. Анекдоты. Гумарэскі / склад. А. С. Фядосік. — Мінск : Навука і тэхніка, 1984. — (Вусная народная творчасць).

8. Загадкі ад Анатоля Зэкава / А. Зэкаў [Электронны рэсурс] // Вясёлка : часопіс для дзяцей. — 2011. — 11 верас. —

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Рэжым доступу: http://www.veselka.by/?p=2016. — Дата доступу: 12.09.2019.

9. *Зэкаў, А.* Дзень шпаку даказваў грак / А. Зэкаў [Электронны рэсурс] // Вясёлка : часопіс для дзяцей. — 2016. — 23 сак. — Рэжым доступу: http://www.veselka.by/?p=8585. — Дата доступу: 22.08.2019.

10. *Колас, Я.* Зімнія халады / Я. Колас // Другое чытанне для дзяцей беларусаў ; прадм. Л. Сеўрук. — Пецярбурх: Загляне сонца і ў нашэ ваконцэ, 1910. — (Факсімільнае выданне).

11. *Мацвеенка, У.* Арэлі / У. Мацвеенка // Вясёлка: часопіс для дзяцей [Электронны рэсурс] — 2018. — 31 жн. — Рэжым доступу: http://www.veselka.by/?p=11908. — Дата доступу: 28.08.2019.

12. *Муравейка, І.* Адно яечка на дваіх / І. Муравейка // Куды ні пойдзеш — цуды знойдзеш : зб. — Мінск : Юнацтва, 2001.

13. *Некрашэвіч, С.* Лемантар / С. Некрашэвіч. — Мінск : Бел. дзярж. выд-ва, 1927.

14. *Некрашэвіч, С.* Роднае слова / С. Некрашэвіч. — Мінск : Сав. Беларусь, 1923.

15. *Радкевіч, Я.* Хто самы моцны? / Я. Радкевіч // Літаратурнае чытанне. 2 клас / Н. У. Антонава [і інш.]. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016.

16. *Санько, З.* Малы расійска-беларусі слоўнік прыказак, прымавак і фразем / З. Санько [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://szlachta.io.ua/s427092/zmicer_sanko_maly_raseyska-belaruski_slonik_prykazak_prymavak_i_frazem. — Дата доступу: 02.10 2019.

17. Скорагаворкі дзеля добрай гаворкі // Умники-разумнікі [Электронны рэсурс]. — 2013. — 27 кастр. — Рэжым

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

доступу: https://umrazum.wordpress.com/2013/10/27/скорагаворкі-дзеля-добрай-гаворкі. — Дата доступу: 07.07.2019.

18. Смяшынкі. Анекдоты : для мал. шк. узросту / уклад. А. Мімрык. — Мінск : Полымя, 1996.

19. Сонца грэе, колас спее : чытанка для дзяцей / склад. А. І. Сачанка. — Мінск : БелЭН, 2018.

20. Хуткамоўкі Рыгора Барадуліна / Р. Барадулін [Электронны рэсурс] // Вясёлка : часопіс для дзяцей. — 2019. — 13 жн. — Рэжым доступу: http://www.veselka.by/?p=13112. — Дата доступу: 22.08.2019.

21. *Церашкова, А.* Чароўныя пацеркі / А. Церашкова // Мова нанова [Электронны рэсурс]. — 30.12.2018. — Рэжым доступу: http://www.movananova.by/dzetkam-zaniatki/kalyadny-padarunak-alena-cerashkova-charounyya-pacerki.html. — Дата доступу: 08.07.2019.

22. Цікавінкі. Загадкі пра зіму : Заняткі № 58. Тэма: Зіма // Мова нанова [Электронны рэсурс]. — 31.01.2015. — Рэжым доступу: http://www.movananova.by/zaniatki/cikavinki-zagadki-pra-zimu.html. — Дата доступу: 08.09.2019.

23. *Чарняўскі, М.* Загадкі / М. Чарняўскі [Электронны рэсурс] // ДУА «Яслі-сад № 16 г. Жлобіна». — Рэжым доступу: https://sad16zhlobin.schools.by/pages/zagadki. — Дата доступу: 12.08.2019.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ЗМЕСТ

НЕ БАІМСЯ МЫ МАРОЗУ І МЯЦЕЛІЦЫ! 3
Зіма. *Паводле Д. Бічэль* 3
Мае канькі. *Паводле Д. Бічэль* 4
Госця. *Паводле М. Маляўкі* 5
Лыжнік. *Паводле М. Маляўкі* 6
Сапраўдныя сябры. *Паводле Я. Бяганскай* 8
На горцы. *Паводле М. Пазнякова* 9
На лыжах. *Паводле П. Пранузы* 11
Зімовая азбука. *Паводле М. Даніленкі* 12
Ветлівая сінічка. *Паводле Т. Мушынскай* 14
Нашы сябры. *Паводле С. Шушкевіча* 17
Кармушкі. *Паводле А. Дзеружынскага* 18
Зайчык. *Паводле М. Пазнякова* 20
Лічылка. *Паводле В. Віткі* 21
Люты. *Паводле К. Каліны* 21
Люты і дзеці. *Паводле Р. Бензерука* 25
Пытанні і заданні для паўтарэння 26

ЖЫВЁЛЫ — НАШЫ СЯБРЫ 27
Каго як завуць? *Паводле А. Клышкі* 27
Мая гаспадарка. *Паводле А. Васілевіч* 28
За качкай ходзяць... *Паводле Н. Галіноўскай* 29
Храбры певень. *Паводле Я. Коласа* 30
Гусак. *Паводле У. Ліпскага* 31
Жарт. *Паводле Н. Галіноўскай* 32
Ма́шына мова і дзедава замова. *Паводле У. Ліпскага* 33
Злодзей. *Паводле Т. Кляшторнай* 35
Бурачок і бычок. *Паводле І. Муравейкі* 36
Каток. *Паводле А. Жаўрука* 37
Дамок для Рэкса. *Паводле М. Пазнякова* 38
Безбілетная падарожніца. *Паводле А. Вольскага* 39
Што за інтэрнат? *Паводле Я. Хвалея* 42

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Хто пра што... *Паводле А. Дзеружынскага* 43
Рагуля-малакуля. *Паводле А. Дзеружынскага* 44
Воўк і ліска. *Паводле А. Дзеружынскага* 45
Гаспадар пушчы. *Паводле В. Вольскага* 46
Белавежа. *Паводле У. Караткевіча* 49
Пытанні і заданні для паўтарэння 52

ПАЧЫНАЕЦЦА ВЯСНА З МАМІНАГА СВЯТА 53
Ажылі пралескі. *Паводле П. Пранузы* 53
Маміны рукі. *Паводле П. Пранузы* 54
Вясна ідзе. *Паводле В. Кастручына* 54
Маміна свята. *Паводле А. Вольскага* 56
Пчала. *Паводле А. Вольскага* 57
Май. *Паводле А. Вольскага* 58
Шпак. *Паводле Т. Кляшторнай* 59
Прылёт птушак. *Паводле Я. Коласа* 59
Мурашкі. *Паводле Я. Коласа* 61
Шпак. *Паводле Я. Журбы* 62
Пралеска. *Паводле В. Вярбы* 63
Песня ручая. *Паводле Л. Шырына* 64
Зямля прачынаецца. *Паводле П. Ткачова* 65
Каб вясна хутчэй настала. *Паводле М. Маляўкі* 67
Вясновыя гукі. *Паводле В. Віткі* 68
Клекатун. *Паводле А. Дзеружынскага* 70
Сустрэча сяброў. *Паводле А. Дзеружынскага* 71
Казёл і капуста. *Паводле А. Зэкава* 71
Садзім алею. *Паводле М. Пазнякова* 72
Вясенняя раніца. *Паводле М. Чарота* 73
На здароўе, сонейка. *Паводле В. Ткачова* 75
Майская казка. *Паводле М. Маляўкі* 77
Май. *Паводле К. Жука* 78
Русачок і Белячок. *Паводле З. Бяспалага* 79
Пытанні і заданні для паўтарэння 81

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ДОБРА ЎСІМ ЖЫВЕЦЦА ЎЛЕТКУ 82
Лета. *Паводле Д. Бічэль* 82
Лета. *Паводле Я. Коласа* 83
Чэрвень. *Паводле В. Вольскага* 86
Ліпень. *Паводле В. Вольскага* 87
Жнівень. *Паводле В. Вольскага* 89
Купалле. *З народнай песні* 90
Каласавічок. *Паводле С. Кухарава* 91
Рэха. *Паводле К. Буйло* 94
Загадкі на градках. *Паводле Р. Барадуліна* 95
На гародзе рос гарох... *Паводле Э. Агняцвет* 96
Па былінках... *Паводле А. Дзеружынскага* 97
Перад дажджом. *Паводле У. Паўлава* 98
Летняя раніца. *Паводле А. Дзеружынскага* 99
Лівень. *Паводле В. Хомчанкі* 100
Мне мілей за ўсё... *Паводле П. Сушко* 102
Па ягады. *Паводле М. Пазнякова* 102
Па арэхі. *Паводле П. Сушко* 103
Ціхая мясціна. *Паводле В. Ткачова* 104
Сонца. *Паводле І. Муравейкі* 106
Летам. *Паводле П. Броўкі* 107
Пытанні і заданні для паўтарэння 108

ЧЫТАЕМ САМІ 109
Русачок і Белячок. *Паводле З. Бяспалага* 109
Коцік, пеўнік і лісіца. *Беларуская народная казка* 110
Як курачка пеўніка ратавала. *Беларуская народная казка* 113
Вожык і ручаёк. *Паводле Я. Галубовіча* 116
Птушыныя напевы. *Паводле А. Дзеружынскага* 117
Пчолы і кветкі. *Паводле С. Валодзькі* 118
Пра што кукуе зязюля? *Беларуская народная казка* 119
Дождж ык і Гром. *Паводле В. Сухамлінскага* 121

Літаратура 122

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва і нумар школы)

Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

Вучэбнае выданне

Воюш Інга Дзмітрыеўна
Аляшкевіч Валянціна Іосіфаўна

ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ

**Вучэбны дапаможнік для 3 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання**

У дзвюх частках

Частка 2

Адказны за выпуск *Т. Ф. Рослік*
Рэдактары *В. Р. Ермаковіч, І. В. Летуновіч*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Мастак *С. Ю. Піскун*
Камп'ютарная вёрстка *В. М. Крупскай*
Карэктар *Н. Б. Кучмель*

Падпісана да друку 13.08.2020. Фармат 70×100 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная № 1. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 10,32 + 0,32 форз. Ул.-выд. арк. 4,6 + 0,4 форз. Тыраж 343 экз. Заказ 139.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вучыцеся гаварыць правільна

1. Адкажыце на пытанні:





Чыё вуха? ... заечае.
Чыя нара? ... лісіная.
Чыя поўсць? ... каціная.
Чый нос? ... мядзведжы.
Чый хвост? ... вавёрчын.
Чые лапы? ... воўчыя.



Гуляйце разам. Складзіце свае пытанні са словамі: чый? чыя? чые? Задайце іх сваім сябрам.

2. Скажыце наадварот (напрыклад: ціхі — гучны...):

добры — ...

мяккі — ...

малы — ...

ісці — ...

вясёлы — ...

гаварыць — ...

3. Складзіце заклічкі са слоў і малюнкаў:

Пчолачка, пчолачка,
ляці на .

Будуць рады
твае .

Слімак, слімак,
выпусці свае .

Дам мукі
на .

Вывучыце заклічкі на памяць.